## Супраць незаконнага гандлю наркотыкамі

**У лютым сёлета пачынаецца рэалізацыя трэцяга этапу беларуска-ўкраінска-малдаўскай праграмы па барацьбе з незаконным абаротам і гандлем наркатычнымі сродкамі (БУМАД-3). Для гэтага Еўрапейская камісія і Праграма развіцця ААН (ПРААН) выдзеліў 670 тыс. еўра на два бліжэйшых гады.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў мінскім офісе ПРААН з 2003 года, у прыватнасці, дзесяць кантрольна-прапускных пунктаў на мяжы Беларусі з Польшчай, Украінай і Літвой былі аснашчаны спецыялізаванай і камп'ютарнай тэхнікай, супрацоўнікі мытняй і пагранічнай службаў прайшлі навучанне методыкам выяўлення выпадкаў правозу наркотыкаў праз мяжу. Для падраздзяленняў МУС, мытнай службы і пагранічных войскаў было набыта аналітычнае праграмнае забеспячэнне, якое актыўна выкарыстоўваецца сёння паліцыямі многіх краін Еўразіі і Інтэрпола для раскрыцця злачынстваў, звязаных з наркотыкамі.

Падчас трэцяга этапу праграмы, як і раней, работа будзе весціся аднолькава ў Беларусі, Украіне і Малдове. За ажыццяўленне праекта ў нашай краіне адказвае МУС.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

## РЦТТ ВЫПУСЦІЦЬ ІНСТРУКЦЫЮ ПА АБАРОНЕ АЎТАРСКІХ ПРАВОЎ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ СТВАРАЛЬНІКАЎ ПРАГРАМНАГА ПРАДУКТУ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра трансферу тэхналогій Аляксандр УСПЕНСКІ.**

Гэты дакумент падагульняе замежны і нацыянальны вопыт афармлення патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў, а таксама дапаможа ў навучанні беларускіх праграмістаў і фірм-вытворцаў праграмнага прадукту таму, як абараняць свае правы і цывілізавана прадаваць прадукцыю за мяжой.

**БЕЛТА.**

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

# АТЭСТАТ са знакам якасці

**Зараз у школах цэнтральнага рэгіёна займаюцца больш чым 174 тысячы вучняў. У дзяцей ёсць магчымасць атрымаць трывалыя веды на самым сучасным узроўні — такое меркаванне выказалі ўдзельнікі пасяджэння выніковай калегіі ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама, якое днямі прайшло ў Дзяржынску.**

На Міншчыне паспяхова праводзіцца работа па дыферэнцыяцыі адукацыі — працуюць 30 гімназій, гімназія-каледж, 6 раённых, а таксама Мінскі абласны ліцэі. У цэнтральным рэгіёне адкрыты 323 ліцэйскія класы (дарэчы, лепшы паказчык у рэспубліцы). Дыферэнцыраванае навучанне цяпер даступнае для амаль 64 працэнтаў школьнікаў Міншчыны. Летась каля 3/4 выпускнікоў паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. За апошнія пяць гадоў гэты паказчык узрос амаль на чвэрць.

З абласнога бюджэту выдаткоўваюцца значныя сродкі. Напрыклад, летась на закупку камп'ютараў і праграмнага забеспячэння выдзелена 3,2 мільярда рублёў. За непрацяглы час практычна ўсе школы Міншчыны былі абсталяваны сучаснай камп'ютарнай тэхнікай. Для параўнання: у 2001 годзе адпаведныя класы мелі толькі 17 працэнтаў школ. Установы адукацыі атрымалі выхад у Інтэрнэт. У Слуцкім і Дзяржынскім раёнах усе агульнаадукацыйныя ўстановы маюць свае сайты.

— Гэта дае магчымасць актыўна ўкараняць новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў навучальны працэс, — заўважае начальнік упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама Таіса Данілевіч. — Зацікаўленасць у атрыманні ведаў стабільна павялічваецца. Адно з яскравых сведчанняў таму — значнае змяншэнне колькасці злачынстваў, якія ўчынены школьнікамі (летась правапарушэнняў зафіксавана амаль на чвэрць менш — такая тэндэнцыя адзначаецца ўпершыню за апошнія гады).

Як адзначыла Таіса Данілевіч, большасць школьнікаў Міншчыны (96 працэнтаў ад агульнай колькасці навучэнцаў) атрымліваюць гарачае харчаванне. Работа 103 сталовых арганізавана па папярэдніх заказах. Акрамя гэтага, у агульнаадукацыйных установах вобласці працуюць і 42 кафэ. Арганізавана аздараўленне дзяцей — на Міншчыне 20 стацыянарных лагераў. А для так званых «цяжкіх» падлеткаў на базе вайсковых часцей штогод арганізоўваюць 33 спартыўна-патрыятычныя летнікі.

Сапраўды балючая тэма — рацыяналізацыя сеткі адукацыйных устаноў. Як заўважыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Таіса Данілевіч, многія звязваюць «згортванне» толькі з эканоміяй бюджэтных сродкаў. Гэта таксама прычына, але далёка не галоўная. Асноўная падстава — складаная дэмаграфічная сітуацыя. За пяць апошніх гадоў колькасць школьнікаў на Міншчыне зменшылася на 41 тысячу чалавек, а да 2010-га, як мяркуецца, зменшыцца яшчэ на 50 тыс. Лічбы, канешне, вельмі ўражваюць. Такая сітуацыя вымушае закрываць установы адукацыі — на працягу 2001-2006 гадоў у Мінскай вобласці спыніла сваю дзейнасць 161 школа (2 сярэднія, 63 базавыя і 96 пачатковых). Каб належным чынам арганізаваць падвоз дзяцей, набываюцца аўтобусы (існуе нават спецыяльная абласная праграма). Летась іх закуплена 24, на што выдзелена 1,2 мільярда рублёў. Сёлета адпаведныя выдаткі застануцца прыкладна на такім жа ўзроўні.

Як адзначыла Таіса Данілевіч, разам з клопатам пра дзяцей важна не забываць і пра педагога. Калі школа закрываецца, то яе настаўнікі абавязкова павінны быць працаўладкаваны. Маладым спецыялістам, якія прыязджаюць у вёску, неабходна ствараць прывабныя ўмовы. Што і робіцца — акрамя гарантый і кампенсацый, якія прадугледжаны працоўным заканадаўствам, такія настаўнікі адразу атрымліваюць яшчэ і важкую дапамогу (10 базавых велічынь). Гэтыя грошы выплачваюцца з рэгіянальных фондаў падтрымкі. А ў Капыльскім і Клецкім раёнах за кошт мясцовых бюджэтаў для маладых спецыялістаў на працягу двух гадоў працы прадугледжана спецыяльная надбаўка — у памеры 20 працэнтаў ад стаўкі заработнай платы.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,** *Мінск—Дзяржынск—Мінск.*

# СЯРЭДНІ ПАКАЗЧЫК ДАТЫЧЫЦЦА ЎСІХ?

**Мінулы год прынёс някепскія вынікі, разам з тым, паводле слоў міністра працы і сацыяльнай абароны Уладзіміра ПАТУПЧЫКА, сёлета стаіць ужо іншая задача — не проста выканаць усе запланаваныя «сацыяльныя» паказчыкі, але і наблізіць іх да кожнага рэгіёна. І перш-наперш гэта датычыцца ўзроўню беспрацоўя, прадастаўлення якасных сацыяльных паслуг, росту пенсій і заробкаў. Прычым, падкрэсліў міністр, у новым годзе трэба звесці да нуля колькасць арганізацый, дзе ўзровень сярэдняй аплаты працы не дасягае прынамсі 200 долараў у эквіваленце.**

## Тарыфная стаўка зменіцца двойчы

Як адзначае статыстыка, па выніках мінулага года сярэдняя па краіне зарплата здолела дасягнуць і нават пераўзысці адзнаку ў 300 долараў ЗША. Аднак ці не больш адметны факт — павелічэнне пакупніцкай здольнасці заробкаў. Калі ў 2005 годзе сярэдні паказчык аплаты працы па краіне адпавядаў 230 працэнтам мінімальнага спажывецкага бюджэту, то летась — двум з палովай «кошыкам». І яшчэ. Паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя Паўлава, у пачатку 2006 года сярэдні ўзровень аплаты працы быў меншым за 200 долараў прыкладна ў 9,4 тыс. арганізацыях краіны. А ў снежні гэта лічба скарацілася амаль удвая.

Рост заробкаў, адзначаюць у міністэрстве, працягнецца і сёлета. Вядома, у рэальным сектары эканомікі ён шмат у чым будзе залежаць ад вынікаў работы канкрэтных прадпрыемстваў. Што да бюджэтнай сферы, то шлях тут застанецца ранейшым — павелічэнне тарыфнай стаўкі І разраду. Як чакаецца, сёлета яна зменіцца двойчы — з 1 красавіка і 1 кастрычніка.

Але рух тарыфнай стаўкі — варыянт не адзіны. У прыватнасці, міністэрствам падрыхтаваны праект урадавай пастановы, якая прадугледжвае павышэнне традыцыйных каэфіцыентаў да тарыфных ставак бюджэтнікаў. Падобнае павышэнне, мяркуюць у міністэрстве, дазволіць у цэлым павысіць заробкі работнікаў арганізацый бюджэтнай сферы на 7, і ў тым ліку такіх заўсёды нізкааплатных работнікаў, як прыбіральшчыкі, гардэробшчыкі ці санітаркі, — больш чым на 10 працэнтаў.

## Чым заняты «неактыўны»?

Каб мець зарплату, трэба працаваць. Між тым, даволі цікавы факт: на працягу мінулага года па дапамогу толькі ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва звярнулася 309,3 тысяч чалавек. І, да слова, гэта амаль на 4 працэнты перавысіла паказчык пазамінулага года.

Як зазначаюць у міністэрстве, нягледзячы на рост колькасці зваротаў, сітуацыя на рынку працы засталася пад кантролем. Значная частка беспрацоўных была ўладкавана на пастаянныя месцы, 26,5 тысячы чалавек прайшлі перанавучанне ці навучанне новым спецыяльнасцям, а каля 380 сем'яў пры падтрымцы службы занятасці пераехалі на новае месца жыхарства і працы. Нарэшце, больш за 2,8 тыс. беспрацоўных атрымалі фінансавую дапамогу на адкрыццё ўласнай справы. Прычым у бізнэс-планах новых прадпрымальнікаў адзначаліся даволі цікавыя напрамкі — напрыклад, рамонт адзення і абутку ў сельскай мясцовасці, рамонт печак, вырошчванне курэй ці пчалярства.

У цэлым на працягу мінулага года ўзровень беспрацоўя па краіне зменшыўся з 1,5 да 1,2 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Сітуацыя палепшылася практычна ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Пінскага і Асіповіцкага раёнаў. І да таго ж нельга не заўважыць: зрухі адбыліся ў большасці традыцыйна «складаных» з пункту гледжання занятасці невялікіх населеных пунктах . Праўда, мяркуюць у міністэрстве, тая ж праблема малых гарадоў і рэгіёнаў, эканоміка якіх фактычна «завязана» на адным прадпрыемстве, застанецца асноўнай і сёлета. Як, зрэшты, і паступовае «ўцягванне» ў легальную эканоміку «неактыўных» грамадзян. Бо гэта — значная крыніца папаўнення працоўных рэсурсаў краіны. Так, паводле ацэнак, зараз у Беларусі афіцыйна нідзе не працуюць, не вучацца, не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не з'яўляюцца беспрацоўнымі і не даглядаюць малых дзяцей каля 730 тыс. чалавек.

## Сям'і патрэбны стымул

Гаворка аб працоўных рэсурсах — асобная. Не сакрэт, што ўпершыню перавышэнне паказчыкаў смяротнасці над нараджальнасцю было адзначана ў 1993 годзе. Не стаўся выключэннем і год мінулы. На працягу яго «страты» насельніцтва краіны склалі каля 46,5 тыс. чалавек.

Разгляд праграмы дэмаграфічнай бяспекі яшчэ наперадзе. Тым не менш, паведаміў Валерый Паўлаў, можна канстатаваць, што аднымі з яе асноўных момантаў стануць павелічэнне памераў дапамог па догляду дзяцей, прадастаўленне дадатковых падатковых ільгот сем'ям у залежнасці ад колькасці дзяцей і наяўнасці дзіцяці-інваліда, падтрымка маладых сем'яў у вырашэнні жыллёвай праблемы. Апроч таго, міністэрствам падрыхтаваны прапановы па змяненню ўмоў прадастаўлення бясплатнага харчавання дзецям да двух гадоў. Мяркуецца, што само права на такое харчаванне будзе прадастаўлена не толькі шматдзетным, няпоўным ці студэнцкім, а ўсім катэгорыям сем'яў без выключэння. Прычым сам «парог» патрэбы для аказання падобнай падтрымкі ўзрасце да 60 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

## Ільготы з новай крыніцы

Зараз на ўліку ў органах па працы і сацыяльнай абароне знаходзяцца каля 2 млн 440 тыс. пенсіянераў. Прычым за мінулы год колькасць тых, каму пенсія была прызначана ўпершыню, узрасла на 3,8 працэнта.

Фактычна, зазначыла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, па сваёй значнасці пенсія з'яўляецца другой крыніцай даходаў беларусаў. Да слова, у снежні мінулага года сярэдняя пенсія па ўзросту перавысіла 290 тыс. рублёў. І па тэмпах росту летась яна «абышла» інфляцыю на 20,1 працэнта.

Павышэнне пенсій працягнецца і ў будучым. Плануецца, што да 2010 года яны павысяцца ў 1,52 раза. Калі ж казаць аб перспектывах больш блізкіх, то тут задачы такія — сёлета рост намінальнай сярэднямесячнай пенсіі па ўзросту павінен вагацца ў межах 15,3-18,5 працэнта. А павелічэнне пенсій рэальных, з улікам змянення цэн на тавары і паслугі, складзе 7,8—8,7 працэнта. Праўда, заўважыла Марыяна Шчоткіна, нельга не прызнаць, што грамадзян, не задаволеных пакупніцкай вартасцю сваіх пенсій, па-ранейшаму шмат. Аднак адна з прычын такога становішча чыста суб'ектыўная — распаўсюджаная ў асобных прыватных арганізацыях практыка выплаты заробкаў у «канвертах». Зразумела, што потым на ўзровень пенсійнага забеспячэння падобныя выплаты паўплываць ніяк не змогуць.

Вось ужо некалькі гадоў у Беларусі не адзначаецца зрываў графікаў разлікаў з пенсіянерамі. Больш таго, цяперашні «запас трываласці» Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва перавышае два месяцы. Тым не менш казаць аб поўнай стабільнасці ўсё ж не выпадае. У краіне працягвае павялічвацца колькасць пенсіянераў. І, як чакаецца, сёлета за пенсіяй звернецца на 10 тыс. чалавек больш, чым летась.

Таму, нагадала Марыяна Шчоткіна, міністэрства падрыхтавала праект новага Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні». У законе ёсць прапанова аб выплаце датэрміновых пенсій па ўмовах працы за кошт назапашвання мэтавых узносаў работадаўцаў. У сваю чаргу гэта дазволіць паступова «разгрузіць» агульную пенсійную сістэму. «Вядома, гаворка ідзе аб няпростым кроку, — адзначыла Марыяна Шчоткіна. — Разам з тым сама рэформа з'яўляецца вымушанай неабходнасцю. Тым больш, што зразумела: нельга прадастаўляць пенсійныя льготы адным фактычна за кошт іншых».

## Дапамога. Без уліку катэгорый

Як сведчыць статыстыка, з 2003 года колькасць маламаёмных грамадзян у Беларусі зменшылася ў 2,5 раза. А сярод працуючага насельніцтва гэты паказчык аказаўся яшчэ больш значным. Прычым, зазначыла першы намеснік міністра Алена Колас, «працоўная малазабяспечанасць» працягне зніжацца. У прыватнасці, вызначана, што да 2010 года памер мінімальнай зарплаты ў краіне выйдзе на новую мяжу — 140 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

Між тым, узровень жыцця — праблема не толькі заробкаў. Ёсць сітуацыі, калі забяспечыць варты ўзровень дабрабыту немагчыма па аб'ектыўных прычынах. І ў гэтым выпадку адным з варыянтаў можа быць адрасная сацыяльная дапамога. Прычым, зазначаюць у міністэрстве, умовы яе прадастаўлення могуць змяніцца ў бліжэйшы час. Сёння ўжо падрыхтаваны праект урадавай пастановы, якая дасць права на адрасную падтрымку не толькі «сацыяльна слабым» катэгорыям, усім без выключэння грамадзянам краіны з даходамі ніжэй 60 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

Дзеля справядлівасці, цяперашняя «планка» дапамогі — момант таксама няпросты. Летась адрасная падтрымка была прызначана на 57 тыс. чалавек. Аднак гэта — толькі малая доля ад невялікай колькасці маламаёмнага насельніцтва краіны. Таму, перакананы ў міністэрстве, «мяжа даходаў» для атрымання выплат павінна паступова павялічвацца — да адзнакі бюджэту пражытковага мінімуму.

Нарэшце, не менш актуальная тэма — лёс ільгот. Як паведаміла Алена Колас, зараз падрыхтаваны новы варыянт законапраекта аб іх упарадкаванні. І бліжэйшым часам праект рэфармавання мяркуецца прадставіць для разгляду парламента.

## Сядзелкі — кожнаму раёну

Адным з галоўных напрамкаў дапамогі пенсіянерам і інвалідам застаецца абслугоўванне на даму. Зараз сацыяльныя работнікі наведваюць 75,7 тыс. пенсіянераў і інвалідаў. У параўнанні з мінулым годам гэта лічба ўзрасла. І перш-наперш за кошт людзей, якія атрымліваюць надомныя паслугі на ўмовах поўнай ці частковай аплаты.

Дарэчы, сітуацыя з надомным абслугоўваннем падаецца шмат у чым паказальнай. Так, можна зрабіць выснову — на паслугі, у тым ліку «за грошы», ёсць попыт. Таму ўжо сёлета грамадзяне краіны змогуць скарыстацца новымі відамі сацыяльнай дапамогі. А адной з найбольш папулярных тут павінна аказацца служба сядзелак. Пакуль яна працуе толькі ў 14 тэрытарыяльных цэнтрах. Аднак, адзначыў намеснік міністра Валяр'ян Кароль, зараз вызначана, што да канца года сядзелкі павінны працаваць ва ўсіх раёнах Беларусі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## МАРАЗЫ І ВЯЛІКІЯ СНЕГАПАДЫ НЕ ПРЫВЯДУЦЬ ДА ЗБОЯЎ У РАБОЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ЭНЕРГАСІСТЭМЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА галоўны спецыяліст дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белэнерга» Уладзімір Кардуба.**

Перашкодай для работы энергетыкаў звычайна становіцца не снегапад, а вецер больш за 20 м у секунду, які валіць дрэвы на лініі электраперадач. Складанасці могуць узнікаць, калі ідзе дождж або мокры снег, і лёд наліпае на правады. Цяпер такіх умоў няма, хоць магчымы выпадкі, калі дрэва пад вагой снежнай шапкі можа ўпасці і абарваць лінію электраперадачы. Яны будуць аператыўна ліквідоўвацца.

Энергетычная бяспека

# БІЯМАСА: НЕ АДХОДЫ, А КРЫНІЦА ЭНЕРГІІ

**Паводле інфармацыі з Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Гродзенскага аблвыканкама, калі летась на мясцовае паліва (дровы) у вобласці было пераведзена 70 зернесушыльных комплексаў, то на гэты год запланавана 121. Таксама прадоўжыцца ў рэгіёне і замена электранагравальнікаў на фермах установкамі з выкарыстаннем мясцовых відаў паліва. А вось што датычыцца біягазавых установак, то канкрэтыкі на гэты конт пакуль няма. Работа ў гэтым накірунку цяпер праводзіцца на некаторых жывёлагадоўчых комплексах на Брэстчыне і ад таго, як яны сябе зарэкамендуюць, будзе, верагодна, залежаць і іх укараненне ў іншых абласцях. Хоць аб здабычы біягазу ў свеце задумаліся даўно.**

Ідэя гэта даволі простая. Любыя арганічныя адходы (прамысловыя, бытавыя ці сельскагаспадарчыя) здрабняюць, пасля чаго яны змяшчаюцца ў закрытыя накапляльныя ёмістасці — так званыя рэактары. Калі тэмпература дасягае 52—53 ˚С, то пачынаецца працэс браджэння. Пры зброджванні да адной тоны гною дабаўляюць прыкладна такую ж колькасць вады, а для паскарэння гэтага працэсу — так званую бактэрыяльную закваску, карацей кажучы, дрожджы альбо, як яшчэ называюць, — інкулянт. Пасля пачатку актыўнага браджэння, прыкладна на сёмыя-восьмыя суткі, частка масы выгружаецца, замест яе дабаўляюць новую сыравіну, а бактэрыяльная закваска працягвае рабіць сваю справу. Газ, які выдзяляецца, назапашваюць.

У выніку з адной тоны гною атрымліваецца каля 40 кубаметраў газу — метану, альбо, як кажуць, біягазу, які можна выкарыстаць у якасці паліва для кацельняў, запраўкі тэхнікі. Канешне, па сваёй каларыйнасці біягаз крыху саступае прыроднаму газу, але ж яго не трэба купляць за мяжой, гэта сваё, мясцовае паліва. Менавіта з мясцовых рэсурсаў, долю якіх, згодна з дзяржаўнай задачай, мы ўжо ў даволі недалёкай перспектыве павінны давесці да 25 працэнтаў у агульным энергетычным спажыванні.

Да таго ж, пасля атрымання біягазу ў астатку застаецца экалагічна чыстае вадкае высокаэфектыўнае арганічнае ўгнаенне — без паху гною, без нітратаў. Адсюль — магчымасць вырошчвання экалагічна чыстай прадукцыі, павышэнне ўрадлівасці палёў. У гэтым пераканаўся інжынер сельгаскааператыва «Путрышкі» Гродзенскага раёна Генадзь Колас, вырабіўшы невялікую біягазавую ўстаноўку, якая забяспечвала яго гаспадарчы ўчастак якасным угнаеннем.

На думку акадэміка Беларускай інжынернай Акадэміі Аляксандра Дарафейчыка, вялізная крыніца атрымання біямасы ў нашай краіне — жывёлагадоўля. У свой час за праект па вытворчасці біягазу з гною ўзяліся ў вёсцы Грандзічы Гродзенскага раёна, аднак ідэю не рэалізавалі, верагодна, таму, што прыйшоў прыродны газ і здавалася, што ніякай альтэрнатывы яму не спатрэбіцца. Цяпер жа псіхалогія пачынае мяняцца. А энергетычны патэнцыял біямасы жывёлагадоўчых ферм і птушкафабрык у Беларусі вельмі сур'ёзны. Яшчэ дзесяць гадоў таму спецыялісты «Гроднаэнерга», прааналізаваўшы выхад біямасы на буйных комплексах, зрабілі выснову аб магчымасці абсталявання ўстановак па вытворчасці біягазу ў Ашмянскім, Бераставіцкім, Ваўкавыскім, Гродзенскім, Іўеўскім, Карэліцкім, Шчучынскім раёнах, каб выкарыстоўваць яго ў якасці паліва для кацельняў (міні-ЦЭЦ).

У цэлым па краіне, паводле ацэнак спецыялістаў, агульная колькасць сцёкаў на сельскагаспадарчых комплексах дасягае 14,7 мільёна тон у год. Іх анаэробная перапрацоўка можа даць не толькі экалагічна бяспечныя мінералізаваныя арганічныя ўгнаенні, але і выхад біягазу ў аб'ёме 450 мільёнаў кубаметраў. Такім чынам, пры ўтрыманні 65 працэнтаў метану ў біягазе энергетычны эквівалент складзе 381,5 тысячы тон умоўнага паліва ў год. А з улікам таго, што ў многіх рэгіёнах краіны жывёлагадоўля на ўздыме, можна разлічваць і на большае. Калі, канешне, у органаў улады і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на гэтых тэрыторыях, ёсць жаданне дзейнічаць у такім накірунку — супрацоўнічаць з айчыннай навукай, вывучаць замежны вопыт. Дарэчы, у Даніі, паводле інфармацыі Аляксандра Дарафейчыка, на біямасе эксплуатуецца ўжо больш за 120 ЦЭЦ, электрычная магутнасць якіх складае 740 МВт, а цеплавая — 1080 МВт. Біягаз у вялікіх маштабах выкарыстоўваецца і ў Германіі, Аўстрыі, Бельгіі, у іншых краінах, там шырока наладжана вытворчасць біягазавых установак.

Даволі істотным мясцовым рэсурсам энергазабеспячэння можа быць і салома, якую нам, як і біямасу не трэба імпартаваць, паколькі шмат дзе ў Беларусі проста выдатная ўраджайнасць збожжавых культур. А павучыцца выкарыстанню саломы можна, у прыватнасці, у польскай сельскагаспадарчай фірмы»Земяплоды» з Торуньскага ваяводства. Гэта гаспадарка апрацоўвае сем тысяч гектараў ворыва і з-за вялізных выдаткаў на энерганосьбіты калісьці была літаральна на мяжы краху. Цяпер жа тут адчуваюць сябе даволі ўпэўнена і найперш таму, што ў сваёй энергетыцы вырашылі задзейнічаць... салому. Пабудавалі тры кацельні па 500 кілават кожная і аказалася, што адзінка цяпла, якая атрымліваецца пры спальванні саломы азімых культур, у 3 і 3,5 раза таннейшая, чым пры выкарыстанні газу і мазуту.

Дарэчы, у энергетыцы Даніі доля саломы складае каля 25 працэнтаў ад агульнага аб'ёму біярэсурсаў. Як правіла, яна выкарыстоўваецца ў сезон, а калі заканчваецца, а новая яшчэ не вырасла, то «эстафету» прымае другі кацёл, дзе ў ход ідуць газ альбо мазут. Персанал такой станцыі складаецца з аднаго чалавека, які падвозіць і закідвае ў кацёл квадратныя цюкі з саломай, а далейшы працэс кантралюе аўтаматыка.

Таксама, лічыць Аляксандр Дарафейчык, мы маглі б скарыстацца еўрапейскім вопытам вырошчвання біямасы на паліва там, дзе глебы малапрыдатныя для аграрнай вытворчасці. Вось прыклад. Каб не «закопваць» грошы ў неўрадлівых для атрымання сельгаспрадукцыі мясцінах, адна невялікая шведская фірма «Agrobransle», якая належыць кааператыву фермераў, механізаваным спосабам вырошчвае хуткарослую вярбу ажно на 14 тысячах гектараў. Пры гэтым з аднаго гектара ў сярэднім атрымліваюць каля 12 тон сухога рэчыва, што эквівалентна 7,5 тоны ўмоўнага паліва (3500 кубаметраў газу).

Паводле ацэнак Аляксандра Дарафейчыка, патэнцыяльны ўраджай сухой масы вярбы ў нашых умовах складае прыкладна 5 тон з гектара на пясчаных глебах і 10,5 тоны — на тарфяніках. Такім чынам, патэнцыял дадатковага біяпаліва з выробленых тарфяных радовішчаў знаходзіцца на ўзроўні 1,2 мільёна тон умоўнага паліва.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# НОВЫЯ ЎМОВЫ. І ранейшыя дамовы

**У 2007 годзе ўрад плануе цалкам выканаць Генеральнае пагадненне з прафсаюзамі і аб'яднаннямі наймальнікаў. Пры гэтым, падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, нягледзячы на рэзкае павышэнне цаны на расійскія нафту і газ, усе пункты пагаднення сёлета застаюцца без змяненняў.**

Як адзначыў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, летась у Беларусі быў забяспечаны эканамічны рост, стабільнасць у фінансавай сферы і на валютным рынку. А ў сваю чаргу гэта дазволіла выканаць дамоўленасці ў рамках Генеральнага пагаднення з прафсаюзамі і аб'яднаннямі наймальнікаў практычна ў поўным аб'ёме. У прыватнасці, сярэдні ўзровень зарплаты па краіне ў снежні выйшаў на адзнаку ў 668 тыс., а па бюджэтнай сферы — 614,9 тыс. рублёў. Ці адпаведна на 311,8 і 287 долараў у эквіваленце.

Яшчэ адзін цікавы вынік — павелічэнне мінімальнай зарплаты. Калі ў 2000 годзе яна адпавядала прыкладна 10 працэнтам бюджэту пражытковага мінімуму, то з канца 2004 года «мінімалка» складала ўжо 100, а летась — 104 працэнты БПМ. Прычым, паведаміў Андрэй Тур, сёлета гэты паказчык павінен выйсці на 108 працэнтаў. Прынамсі, зараз урадам падрыхтавана пастанова, якая вызначае сёлетнюю мінімальную зарплату ў Беларусі на ўзроўні 179 тыс. рублёў.

Дарэчы, летась рост сярэдняй зарплаты склаў 25,8 працэнта. У той час як, да прыкладу, тарыфы на жыллё і камунальныя паслугі ўзраслі на 14,1, на праезд у гарадскім транспарце агульнага карыстання — на 27,7, на праезд у прыгарадным аўтатранспарце — 21,8, у прыгарадным чыгуначным транспарце — на 19,6, на газ — на 13,8, на паліва — на 20,6 працэнта. А ў цэлым цэны на спажывецкія тавары і паслугі павялічыліся на 7 працэнтаў. Такім чынам, адзначыў намеснік міністра, у мінулым годзе рост зарплаты зноў «апярэдзіў» інфляцыю. Праўда, заўважыў намеснік міністра, сітуацыя з заробкамі была не такой адназначнай. Даводзіцца канстатаваць, што летась узровень вытворчасці працы ў цэлым па эканоміцы склаў 8,2 працэнта. І гэта лічба аказалася адразу ўдвая меншай за паказчык росту рэальнай зарплаты.

Сітуацыя ў эканоміцы, заўважыў Андрэй Тур, паспрыяла выкананню і іншых значных пунктаў Генеральнага пагаднення. Так, у 2006 годзе была практычна ліквідавана запазычанасць па выплаце заробкаў, не адзначалася выпадкаў затрымак па разліках з пенсіянерамі, адбыўся 12-працэнтны рост стыпендый, удалося павялічыць тэмпы росту будаўніцтва жылля. Нарэшце, таксама адметны момант — зніжэнне паказчыкаў беспрацоўя. На пачатак года яго ўзровень склаў 1,2 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва краіны.

Такі малюнак аказаўся ў цэлым. Разам з тым, паводле слоў намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Андрэя Лук'яновіча, нельга абмінуць увагай і некаторыя праблемы. Як засведчыў маніторынг ФПБ, на працягу мінулага года адзначаліся асобныя выпадкі парушэнняў наймальнікамі тэрмінаў выплаты заробкаў, а таксама — выпадкі налічэння зарплаты ў памеры менш за «мінімалку». Прычым найбольш часта ў ролі парушальнікаў тут аказваліся сельгаспрадпрыемствы і арганізацыі недзяржаўнай формы ўласнасці з невялікай колькасцю работнікаў. Другой «балючай кропкай», лічаць у прафсаюзах, па-ранейшаму застаецца тэма кантрактаў — у дадзеным выпадку «нестыкоўкі» з заканадаўствам сустракаюцца ў асобных арганізацыях па ўсіх галінах і па ўсіх рэгіёнах без выключэння. Таму, паведаміў Андрэй Лук'яновіч, Федэрацыя прафсаюзаў падрыхтавала чарговы пакет прапаноў па паляпшэнню становішча работнікаў пры пераводзе на кантрактную форму найму і гатова весці новыя этапы перамоў па гэтай праблеме з урадам.

Нарэшце, асобная гаворка аб рынку працы. Сёння становішча на ім падаецца стабільным. Аднак, на думку Андрэя Лук'яновіча, своеасаблівым «падводным камнем» з'яўляецца рашэнне аб тым, што ў будучым дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў павінна здзяйсняцца толькі з прыцягненнем членаў іх сем'яў і блізкіх сваякоў. Такі падыход, мяркуюць у ФПБ, можа прывесці да згортвання малога бізнэсу, і, адпаведна, — да росту беспрацоўя.

Дзеля справядлівасці, канстатаваў Андрэй Лук'яновіч, выкананнем Генеральнага пагаднення ў 2006 годзе Федэрацыя прафсаюзаў задаволена. І ўсё ж галоўнае пытанне на сёння — чаго чакаць ужо ў бліжэйшым часе пасля змянення ўмоў імпарту расійскіх энерганосьбітаў?

Як зазначыў першы віцэ-прэм'ер урада Уладзімір Сямашка, падаражанне расійскіх нафты і газу было шмат у чым прадказальным. У прыватнасці, яно тлумачыцца тым, што буйным «сыравінным» кампаніям суседняй краіны даводзіцца тэрмінова шукаць вялікія сродкі на распрацоўку новых радовішчаў. Непрыемным «сюрпрызам» аказалася іншае — занадта хуткі «скачок» цэн. Па сутнасці на нафту яны ўзраслі на чвэрць, а на газ — адразу ў 2,14 раза. Прычым у перспектыве кошт газу будзе павялічвацца на 18—19 долараў штогод.

Сітуацыя аказалася няпростай. І ў той жа час, падкрэсліў Уладзімір Сямашка, зусім не катастрафічнай. Ужо зараз Беларусь мае тавары, запатрабаваныя на знешніх рынках. Да таго ж сведчаннем якасных змяненняў да лепшага застаюцца тэмпы росту інвестыцый у асноўны капітал, якія склалі летась 31,4 працэнта. Маецца на ўвазе, што прадпрыемствы ўсё больш актыўна вядуць тэхнічнае пераўзбраенне. А гэта, лічаць ва ўрадзе, дазволіць захаваць канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі надалей. І пры гэтым — не толькі ў Расіі.

Тым больш, што з улікам новых рэалій урадам былі прынятыя пэўныя меры. Так, нягледзячы на двухразовае падаражанне газу, унутраныя цэны на электраэнергію павялічыліся на 21,2 працэнта. Гэта, заўважыў Уладзімір Сямашка, сталася магчымым толькі праз мэтавае дацыраванне энергетычнай галіны. Аналагічнай аказалася і сітуацыя з камунальнымі паслугамі. Зноў-такі дзякуючы датацыям удалося стрымаць рост тарыфаў на ўзроўні 20 працэнтаў па электраэнергіі і газу, а таксама на ўзроўні 12 працэнтаў — па ацяпленню. Урэшце, аплата за «стандартную» двухпакаёўку ўзрасла ў межах 5 долараў. І, заўважыў Уладзімір Сямашка, у бліжэйшы час ніякіх новых павышэнняў тут чакаць не трэба.

Прычым, падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер, урад мае намер выканаць усе паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. І ў тым ліку гэта датычыцца планаў па абмежаванню інфляцыі на ўзроўні 7 працэнтаў за год, а таксама планаў па росту заробкаў. Па выніках сёлетняга снежня сярэдняя зарплата па краіне павінна складаць не менш за 350, а па выніках 2010 года — не менш за 500 долараў у эквіваленце. Апроч таго, чакаецца, што новыя эканамічныя ўмовы не прывядуць да павелічэння беспрацоўя. Прынамсі, паведаміў Уладзімір Сямашка, да 2010 года ў краіне павінна з'явіцца каля ста новых прадпрыемстваў ці іх структурных падраздзяленняў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Спорт-тайм

### КІЙ У ГУЛЬНІ

**У Мінску праходзіць першы этап Кубка Еўропы па пірамідзе.**

У самых папулярных спаборніцтвах па рускаму більярду выступіць звыш 150 майстроў кія. Сярод іх — чэмпіёны Еўропы Аляксандр Паламар, Кірыл Анішчанка, Настасся Лупава, Алена Русакова, чэмпіёны і прызёры сусветнага першынства Яраслаў Вінакур, Ілья Кірычкоў, Ганна Мажырына, Жанна Шматчанка, Алена Бунас, Яўген Курта.

Кубак Еўропы арганізаваны па прыкладу еўратураў па пулу: удзельнічае любы жадаючы, на працягу года адбываецца чатыры этапы, па выніках якіх адбіраюцца 32 мацнейшыя, яны і змагаюцца за галоўны прыз. Упершыню Кубак Еўропы па пірамідзе быў разыграны ў 2005 годзе. Першым уладальнікам трафея стаў украінец Аляксандр Бойка. Дарэчы, летась спаборніцтвы сталі праводзіцца асобна паміж мужчынамі і жанчынамі. У розны час на п'едэстал уздымаліся беларусы Яўген Курта, Уладзіслаў Васіленка, Алена Бунас і Віялета Клімава. Прызёры і пераможца сёлетняга першага этапу стануць вядомыя ў нядзелю: а 12-й гадзіне пачнецца жаночы фінал, а 14-й — мужчынскі. Пачынаючы з чвэрцьфіналу, гульні праводзяцца ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе «Атлант» (вул. Сапёраў, 5). Уваход бясплатны.

### ДЗЕВЯТАЯ РАКЕТКА СУПРАЦЬ ДВАНАЦЦАТАЙ

Капітан мужчынскай тэніснай зборнай Беларусі Дзмітрый Татур назваў склад каманды на матч 1/8 розыгрышу Кубка Дэвіса, што пройдзе ў сталічным манежы 9—11 лютага: 29-гадовы Максім Мірны (55-е месца ў адзіночным разрадзе сусветнага рэйтынгу і 1-е ў парным), 28-гадовы Уладзімір Валчкоў (729 і 1085 ракетка), 18-гадовы Павел Катляроў (856-ы і 1311-ы) і 19-гадовы Сяргей Тарасевіч (936-ы і 609-ы). У складзе шведскай дружыны — 22-гадовы Робін Содэрлінг (26-ы і 315-ы), 34-гадовы Йонас Б'ёркман (46-ы і 2-і), 31-гадовы Томас Юхансан (104-ы і 135ы) і 32-гадовы Сімон Аспелін (без адзінага рэйтынгу ў адзіночным разрадзе і 18-е месца ў парным). У рэйтынгу Кубка Дэвіса беларусы займаюць 9-ю пазіцыю, а сапернікі са Швецыі — 12-ю. Аднак скандзінавы сем разоў заваёўвалі Кубак і пяць разоў гулялі ў фінале. Найвышэйшае ж дасягненне нашай каманды — выхад у паўфінал у 2004-м.

### «МАЛАДЗЁЖКА» СТАЛА ДРУГОЙ У КАТАРЫ

**Маладзёжная зборная Беларусі па футболу заняла другое месца на турніры ў Катары.**

У фінале нашы ігракі ўступілі егіпцянам — 1:4, хоць да 83-й хвіліны лік быў нічыйным, ды і першы мяч забіў беларус Кісляк (з пенальці). Нагадаем, што ў спаборніцтвах выступала сем зборных з трох кантынентаў, прычым беларуская дружына была скампліктавана з юнакоў ва ўзросце на год маладзейшых за сваіх сапернікаў.

### ЦУДА-ГОЛ НЕ ВЫРАТАВАЎ ЦСКА

**Гол паўабаронцы маскоўскага футбольнага клуба ЦСКА Юрыя Жыркова ў вароты нямецкага «Гамбурга» прызнаны лепшым мячом Лігі чэмпіёнаў на групавым этапе.**

Аб гэтым паведаміў афіцыйны часопіс самага прэстыжнага еўрапейскага клубнага турніру. Нагадаем, што Жыркоў забіў гол на 65-й хвіліне: прыняў перадачу ў цэнтры поля і на шляху да варот саперніка перагуляў чатырох ігракоў і галкіпера «Гамбурга» і трапіў у пустую «рамку». Праўда, аўтар цуда-гола не выратаваў сваю каманду ад паражэння. Армейцы не выйшлі ў 1/8 фіналу.

**Ірына ПРЫМАК.**

## Крымінал

### УЗЛОМШЧЫК ЗНЁС ГРОШЫ І ЗОЛАТА

**Добры куш дастаўся злачынцу, якому ўдалося пранікнуць у кватэру жыхаркі Заслаўя: крымінальнік прыхапіў і грошы, і вырабы з золата.**

Праваахоўнікі зараз расшукваюць нахабніка, які, ўзламаўшы дзверы кватэры, «экспрапрыіраваў» у гаспадыні жылля нажытае дабро. У прыватнасці, здабычай злодзея стала 3 тысячы 800 долараў ЗША, 300 еўра, 615 тысяч рублёў і залатыя ювелірныя вырабы на агульную суму 10 мільёнаў 516 тысяч рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### МАЛАТОК ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў ЗБРОЮ...

**У руках 19-гадовага жыхара Брэста звычайны малаток стаў сапраўднай зброяй, з дапамогай якой ён расправіўся з адной жанчынай, напаў на другую...**

Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, праваахоўнікамі каля трох гадзін ночы (праз дваццаць мінут пасля ўчыненага злачынства) у Брэсце быў затрыманы малады чалавек, які падазраецца ў забойстве. Як мяркуецца, менавіта ён у адной з кватэр пасля выпітых алкагольных напояў паспрачаўся з гаспадыняй і яшчэ адной непрацуючай жанчынай. Спрэчка вылілася ў бойню: схапіўшы малаток, злачынца ўчыніў забойства гаспадыні кватэры — 63-гадовай пенсіянеркі і нанёс адкрытую чэрапна-мазгавую траўму і рану ў вобласці скроні 48-гадовай непрацуючай.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Утерянные страховые полисы по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ представительства ЗАСО «ТАСК» в г. Минске № 2 серия АД № 7427620 и АД № 7427623 *считать недействительными.*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

2 ЛЮТАГА 2007 г. ПЯТНІЦА № 5 (15456)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

## МОСТ ПАМІЖ ДЗВЮМА КУЛЬТУРАМІ

**Прэзентацыя Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя прайшла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Такім чынам Беларусь стала трэцяй у СНД краінай (услед за Расіяй і Узбекістанам), дзе будзе дзейнічаць Інстытут кітаязнаўства.**

Першы інстытут кітаязнаўства быў адкрыты ў Сеуле ў лістападзе 2004 года. Зараз у 34 краінах іх адкрыта каля 80. А ўсяго Кітай мае намер стварыць у свеце 100 такіх інстытутаў.

Урад КНР аказаў аднаразовую фінансавую дапамогу на перыяд станаўлення інстытута ў Беларусі, які быў створаны ў снежні 2006 года на базе Рэспубліканскага цэнтра БДУ «Іерогліф». Таксама кітайскі бок плануе накіраваць у Беларусь і двух сваіх выкладчыкаў. З цягам часу плануецца пераход інстытута на самаакупнасць.

У задачы, якія ставяцца перад Інстытутам Канфуцыя, уваходзіць прапаганда ў Беларусі кітайскай мовы і культуры, рэалізацыя адукацыйных праектаў у сферы вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, арганізацыя курсаў і стажыровак па кітаязнаўству і ўсходазнаўству, падтрымка выкладання ў нашай краіне кітайскай мовы. Акрамя таго Інстытут кітаязнаўства, як спадзяюцца яго стваральнікі, павінен будзе актывізаваць абмен паміж дзвюма краінамі інфармацыяй у сферы эканомікі і спрыяць устанаўленню кантактаў паміж прадпрыемствамі і фірмамі. У сувязі з гэтымі задачамі ў структуры інстытута створаны два цэнтры — лінгвакраіназнаўства, а таксама эканомікі і маркетынгу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Абітурыент—2007

# У ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ «ДРОБЯЗЯЎ» НЕ БЫВАЕ

***У апошнім нумары «ЧЗ» абмяркоўвалася праблема адпаведнасці ўзроўню складанасці тэстаў тым задачам, якія ставяцца перад цэнтралізаваным тэсціраваннем, а менавіта неабходнасці ранжыраваць прэтэндэнтаў на званне студэнта. Сёння сваімі думкамі наконт арганізацыі прыёмнай кампаніі дзеляцца дэкан эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхаіл Кавалёў і рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Міхаіл Батура.***

**Міхаіл КАВАЛЁЎ:**

— Наш факультэт яшчэ два гады таму адмовіўся ад правядзення ўласных выпрабаванняў, замяніўшы іх залічэннем па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. І ў нас пакуль не было падстаў, каб аб гэтым пашкадаваць. Толькі што завяршылася зімовая сесія, якая прадэманстравала поўную карэляцыю паспяховасці першакурснікаў з вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання. Чым вышэйшыя тэставыя балы ў сертыфікатах, тым лепш вучыцца студэнт і ў нас. Напрыклад, дзяўчына, якая на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы здолела набраць 100 балаў, усе матэматычныя і інфармацыйныя дысцыпліны таксама здае толькі на «дзесяткі». Дарэчы, раней далёка не заўсёды мы назіралі карэляцыю вучэбных поспехаў нашых студэнтаў з іх адзнакамі ў школьных атэстатах. Я лічу, што дзеці цалкам адаптаваліся да цэнтралізаванага тэсціравання.

Адзінае, што яшчэ неабходна зрабіць, гэта больш актыўна задзейнічаць магчымасці сучасных інфармацыйных тэхналогій. Абітурыенты павінны мець доступ да тэстаў мінулых гадоў, каб з дапамогай Інтэрнэта бесперапынна самастойна правяраць сваё веды. Магчыма, у гэтым выпадку знікне і патрэба ў рэпетытарах...

Да недахопаў цяперашняй сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання я б аднёс шкалу пераводу тэставых балаў у дзесяцібальную сістэму ацэнкі ведаў. Не зусім зразумела, чаму для кожнай дысцыпліны зацвярджаецца свая шкала? Чаму 84 балы па матэматыцы — гэта «васьмёрка» па дзесяцібальнай шкале, а 85 балаў — гэта «дзявятка»? Для павышэння даверу сістэма павінна быць максімальна дакладнай, зразумелай і празрыстай.

Ажыятаж, з якім сутыкнуліся мінулым летам прыёмныя камісіі многіх ВНУ, на маю думку, няцяжка было прадказаць. Пасля аб'яднання патокаў падача дакументаў і залічэнне ў пераважнай большасці ВНУ праходзілі адначасова, прычым у даволі сціслыя тэрміны, таму абітурыенты бегалі з адной ВНУ ў іншую, спрабуючы прaлічыць свае шанцы на паступленне. Але навошта гэта мітусня? Асабіста я перакананы, што абітурыенты павінны мець магчымасць вызначыцца з выбарам навучальнай установы яшчэ да афіцыйнага старту прыёмнай кампаніі. А для гэтага трэба публікаваць рэйтынгі беларускіх ВНУ і спецыяльнасцяў, як гэта робіцца ва ўсіх краінах свету. Можна таксама пазычыць вопыт ЗША, дзе практыкуюцца індывідуальныя рэйтынгі, калі малады чалавек сам вызначае галоўныя для сабе крытэрыі і ўжо на падставе яго прэферэнцый складаецца пералік ВНУ, якія адпавядаюць патрабаванням у парадку акрэсленых прыярытэтаў. Абітурыенты, як правіла, ведаюць, якую суму балаў трэба набраць для таго, каб паступіць у Гарвард, а калі набраў меншую суму балаў, то дарога табе ў правінцыйны ўніверсітэт з больш «сціплым» рэйтынгам. Беларусь, напэўна, адзіная з краін СНД не складае і не публікуе рэйтынгі сваіх вышэйшых навучальных устаноў.

Інфармацыйнае забеспячэнне абітурыентаў — гэта наш прабел. Для прыкладу, Інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі мог бы збіраць заяўкі ад абітурыентаў, аналізаваць усю неабходную інфармацыю і паведамляць, што набраўшы 300 балаў, на эканамічны факультэт БДУ ты не зможаш паступіць, але гэтых балаў хопіць для паступлення на эканамічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Так робяць, напрыклад, у Германіі. А ў немцаў гэту сістэму пазычылі літоўцы. Праўда, у Германіі па такой заяве ажыццяўляецца таксама і залічэнне ў студэнты (у залежнасці ад выказаных абітурыентам пажаданняў і сумы набраных балаў). Мы яшчэ, напэўна, не гатовыя да цэнтралізаванага залічэння, але першы крок у гэтым накірунку трэба зрабіць — зарыентаваць маладога чалавека, на навучанне ў якой ВНУ ён можа са сваімі баламі разлічваць. Напэўна, пры такой арганізацыі прыёмнай кампаніі менш было б трагедый і расчараванняў.

**Як стала вядома журналісту «Звязды», будучым летам абітурыенты змогуць азнаёміцца з вынікамі здачы цэнтралізаванага тэсціравання не толькі на сайтах ВНУ і Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, але і па мабільнаму тэлефону. Для гэтага трэба будзе толькі адправіць загадзя са свайго мабільніка запыт па ўказаных нумарах (іх паведамяць крыху пазней). І як толькі Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў перадасць аператарам мабільнай сувязі базу з вынікамі ўдзельнікаў цэнтралізаваных тэставых выпрабаванняў, апошнія тут жа атрымаюць доўгачаканыя SMS-паведамленні. Праўда, за гэту паслугу давядзецца заплаціць. Кошт пакуль таксама не ўстаноўлены.**

Нават узяць такую «дробязь». Непасрэдна ў момант падачы абітурыентам у прыёмную камісію дакументаў, гэта інфармацыя павінна туда ж ўводзіцца ў камп'ютар. І калі план набору складае 60 чалавек, а ты са сваёй колькасцю балаў займаеш у агульным рэйтынгу прэтэндэнтаў толькі 62-е месца, значыць, трэба хуценька пераарыентавацца на іншую спецыяльнасць ці іншую ВНУ. А ў нас пакуль атрымліваецца, што ў адной ВНУ — густа, а ў іншай — пуста.

**Міхаіл БАТУРА:**

— Новыя Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія ўпершыню зацвярджаліся ўказам кіраўніка нашай дзяржавы, дазволілі аптымізаваць прыёмную кампанію і зняць многія пытанні. Адзіныя тэрміны падачы дакументаў у ВНУ прывялі да таго, што ў 2006 годзе да нас прыйшоў прафесійна зарыентаваны студэнт. Але ў 2007 годзе нам хацелася б правесці прыёмную кампанію яшчэ больш арганізавана. А для гэтага трэба ўстанавіць ва ўсіх ВНУ адзіную форму зместу інфармацыі аб ходзе падачы дакументаў і адзіныя для ўсіх тэрміны яе абнаўлення.

Вопыт папярэдняга года паказаў, што ў адной ВНУ абітурыентам прадстаўляюцца тры радкі карыснай інфармацыі, у іншай — пяць і г.д., у адной ВНУ інфармацыя абнаўляецца кожны дзень, а ў іншай — адзін раз у тры дні. І абітурыент не можа правільна ацаніць сітуацыю. Гэта элементарны клопат аб абітурыентах. І другое, на што хацелася б звярнуць увагу. У Міністэрстве адукацыі павінен пастаянна дзейнічаць кансультацыйны пункт па пытаннях прыёмнай кампаніі для членаў прыёмных камісій, куды можна было б звярнуцца ў любы момант і з любым пытаннем. Нярэдка адзін і той жа пункт у правілах прыёму можна трактаваць па-рознаму. А калі размова ідзе пра будучыню маладых людзей, недаравальных памылак быць не павінна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота БЕЛТА.

**Прынятыя ў Беларусі ў сферы маладзёжнай палітыкі меры дазволілі ў прынцыпе вырашыць праблемы «ўцечкі мазгоў». Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў беларускага парламента Уладзімір Канаплёў на сустрэчы з дэлегатамі другога з'езда Садружнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый. Сярод дэлегатаў -- прадстаўнікі Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Арменіі.**

# Я Б У БУДАЎНІКІ ПАЙШОЎ. ЦІ НАВУЧАЦЬ?

**Сістэма прафтэхадукацыі Міншчыны своечасова адаптуецца да патрабаванняў рынку працы. У адпаведнасці з чым мэтанакіравана праводзіцца работа па карэкціроўцы аб'ёмаў і структуры прыёму навучэнцаў. Гэта адбываецца ў залежнасці ад вынікаў фактычнага працаўладкавання выпускнікоў, а таксама па заяўках і дагаворах прадпрыемстваў аб падрыхтоўцы патрэбных кадраў.**

Як паведамілі ў Галоўным упраўленні ідэалагічнай работы Мінскага аблвыканкама, штогод пераглядаецца пералік прафесій, па якіх вядзецца падрыхтоўка. Напрыклад, у 2005 годзе па заяўках арганізацый-заказчыкаў «з'явіліся» 17 спецыяльнасцяў у 11 прафесійна-тэхнічных навучальных установах, а летась — яшчэ 19. У такім разе з працаўладкаваннем выпускнікоў ніякіх праблем не ўзнікае. Асаблівая ўвага надаецца падрыхтоўцы кадраў для будаўнічай галіны. Адпаведныя спецыяльнасці зараз карыстаюцца вялікім попытам на рынку працы. Напрыклад, па заяўцы ААТ «Салігорскпрамбуд» у мясцовым ПТВ № 72 пачалася падрыхтоўка арматуршчыкаў, бетоншчыкаў і каменшчыкаў. Штогод на гэтыя спецыяльнасці плануецца прымаць па 30 чалавек. У першую чаргу такая сітуацыя звязана з тым, што апошнім часам у Беларусі адбываецца сапраўдны будаўнічы «бум» — аб'ёмы работ павялічваюцца, а кваліфікаваных кадраў не хапае.

У цэнтральным рэгіёне вырашана гэтую патрэбу задаволіць. Летась было прынята спецыяльнае рашэнне Мінскага аблвыканкама, у адпаведнасці з ім кантрольныя лічбы прыёму навучэнцаў на падрыхтоўку спецыялістаў для будаўнічай галіны былі павялічаны на 250 чалавек. Усяго па вызначаных спецыяльнасцях было залічана амаль 1,5 тысячы навучэнцаў, што складае 21,1 працэнта ад агульнай колькасці першакурснікаў 15 прафесійна-тэхнічных устаноў Міншчыны, дзе вядзецца падрыхтоўка кадраў для будаўнічай галіны.

Як адзначылі ў Галоўным упраўленні ідэалагічнай работы Мінскага аблвыканкама, на наступны навучальны год плануецца яшчэ павялічыць план прыёму па адпаведных спецыяльнасцях. Таксама рыхтуюць электраманцёраў і электрагазазваршчыкаў. У мінулым годзе на базе міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў па будаўнічых спецыяльнасцях прайшлі неабходную падрыхтоўку 79 школьнікаў, а сёлета такіх ужо ўдвая больш.

Дарэчы, магчымасць атрымаць будаўнічую прафесію ёсць і ў дарослых — па накіраванню цэнтраў занятасці, прадпрыемстваў, а таксама па ўласнаму жаданню (калі заключаецца адпаведны «вучэбны» дагавор») яны спасцігаюць азы майстэрства ў ПТВ. У мінулым навучальным годзе такім чынам прайшлі падрыхтоўку 440 чалавек, перападрыхтоўку — 159, кваліфікацыю павысілі 27 чалавек. Як бачым, шляхоў для таго, каб стаць будаўніком, на Міншчыне шмат.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ПАРЛАМЕНТ, ХАКЕЙНАЯ КАМАНДА І МУЗЕЙ. ГЭТА — ВЯСКОВАЯ ШКОЛА!



**Школы вясковыя — іншыя, не такія, як у горадзе. Можа атмасфера ў іх свая, асабістая, ці адносіны паміж вучнямі і настаўнікамі больш цёплыя, ці сам працэс выхавання і навучання адрозніваецца. І клопатаў у дырэктара вясковай школы больш. Гэта ў горадзе ўсё пад бокам, вучні (нават такая, на першы погляд, дробязь) самастойна прыходзяць на заняткі, або кагосьці бацькі на ўласным аўтамабілі падвозяць на вучобу. А, напрыклад, школу, якая знаходзіцца ў вёсцы Ілья, наведваюць вучні з 20 бліжэйшых населеных пунктаў Вілейскага раёна. У любое надвор'е два школьныя аўтобусы прывязуць і адвязуць назад, у самую далёкую вёсачку, дахаты ўсіх дзетак. І недастаткова толькі забяспечыць школьнікаў транспартам і штодзённым харчаваннем. Галоўнае, каб вясковыя вучні атрымлівалі якасную, канкурэнтаздольную адукацыю.**




Дырэктар Ігар ЮШКО выкладае геаграфію...

Самая вялікая ў Вілейскім раёне вясковая дзяржаўная ўстанова адукацыі Ільянская сярэдняя агульнаадукацыйная школа з краязнаўчым ухілам імя А.А. Грымаця праз пяць гадоў адзначыць сваё 150-годдзе. Ужо сам узрост гэтай школы выклікае цікавасць да яе. Калі накіроўваліся туды, то, канешне ж, ведалі, што яна адна з лепшых у раёне, што там добры працэнт паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, моцны настаўніцкі калектыў... Па гэтых крытэрыях звычайна ацэньваюць работу школ. Але гэтага недастаткова, каб зразумець, што ёсць вясковая школа і якую вялізную працу яна робіць. Вось гэта мы і высвятлялі.

...«На ўроку дурэюць, кідаюцца ў другіх смяццём». «Ня вывучыў рускай. Па сяле не лётай, а вучы урокі», — гэта заўвагі ў школьным дзённіку вучня школы. Звычайны такі дзённік, на першы погляд крыху састарэлы. Толькі замест «смяццём» зараз пішуць «смеццем». І не дзіва, таму што правіла змяніліся — запіс заўваг датуецца 17 маем 1941 года... Дырэктар Ігар Юшко знаёміць з пакоем школьнага музея: «Што сталася з уладальнікам гэтага дзённіка нам, на жаль, невядома, затое рэч яго засталася. І будзе захоўвацца яшчэ доўгі час».

На самай справе і музеі тут два, і завуцца яны школьнымі, магчыма, толькі ўмоўна. «Цягнуць» экспазіцыі і даследаванні па гісторыі краю, літаратурнай і грамадскай дзейнасці яго жыхароў і славутых беларусаў на дарослы, афіцыйна створаны краязнаўчы музей. І экскурсаводы тут ёсць, і нават навуковая база — хутка па даследаваннях, якія зрабілі ў вялікай ступені па літаратурных матэрыялах і дакументах, сабраных Ільянскай школай, будзе выдадзена кніга.

— А ведаеце, адкуль пайшоў выраз «Трымай, фашыст, гранату»? — пытаецца Ігар Юшко.

— Шчыра кажучы, не.

— Вось, — паказвае корпус нямецкай проціпяхотнай гранаты ваенных часоў, — такія гранаты мелі ўласцівасці запаволенага дзеяння — не выбухалі больш працяглы час. Немцы кідалі гранату ў нашы акопы, дзе савецкі воін паспяваў перахапіць яе і кінуць, вярнуць яе да фашыстаў. У варожым акопе граната і выбухала.

Экспанаты музея пастаянна папаўняюцца, нават ужо і месца няма ў памяшканнях. Вось стэнд, прысвечаны ахвярам Халакоста — школа супрацоўнічае і з музеем яўрэйскай гісторыі і культуры, днямі адна з вучаніц атрымала Ганаровую грамату з Масквы, дзе яе работа ўдзельнічала ў тэматычным міжнародным конкурсе. Асобна прадстаўлены тут куток у памяць аднаго з заснавальнікаў нацыянальнай педагогікі прафесара Адама Грымаця. Вучань Ільянскай школы, народжаны ў гэтых краях, Адам Антонавіч усё жыццё не забываў пра сваю першую alma mater, наведваў яе пастаянна. Некалькі гадоў таму школа стала звацца яго прозвішчам.

Менавіта таму школа і краязнаўчая. Да таго ж, акрамя ведаў, якія дзеці атрымліваюць ад дзейнасці музея, яны яшчэ знаёмяцца з гісторыяй свайго краю, Беларусі, вывучаюць шляхі славутых дзеячаў мінуўшчыны і сучаснасці. Каб яшчэ больш прыцягнуць школьнікаў да вывучэння роднай гісторыі, распрацоўваюць тут і карту турыстычных маршрутаў. Іх некалькі, і на кожным па аднаму-два дзесяткі аб'ектаў. «Гэта дазваляе дзецям і з карысцю праводзіць вольны час, і выхоўваць іх, павышаць узровень адукаванасці, прывіваць любоў да родных мясцінаў», — кажа дырэктар Ігар Аляксандравіч Юшко, які сам дасканала ведае кожны навакольны каменьчык. Хоць і скончыў ён гэтую ж школу, але лёс пакідаў па свеце. Пасля праходжання «тэрміновай» трапіў ён у Новасібірскае вышэйшае ваеннае вучылішча. Служыў у кіргізскім Бішкеку, грузінскім Ахалкалакі, нямецкім Гота. Пасля вываду войскаў Савецкай Арміі з Германіі і скарачэння вайсковых штатаў вырашылі яны з жонкай вярнуцца ў родныя мясціны.



— У апошнія гады мы змянілі мадэль адукацыі. Зараз абапіраемся на ўдзел бацькоў у педагагічным працэсе. Адначасова самі дзеці могуць па жаданню павярнуць педагогаў у бок, які больш зручны для іх, — кажа дырэктар. — Таму што ў школе ўжо пяць гадоў дзейнічае школьнае самакіраванне.

Ідэя гэтая была рэалізавана ў школе раней, між тым вучнёўскае самакіраванне стала распаўсюджвацца па школах толькі некалькі гадоў таму. Тут ёсць свая, вучнёўская рэспубліка, дзе кіруюць, адпаведна, прэзідэнт, прэм'ер-міністр, дэпутацкая група. «Уладныя паўнамоцтвы» ў ільянскай школьнай «рэспубліцы» падзелены паміж прэзідэнтам і старшынёй школьнай ячэйкі БРСМ.

— Кожны клас уяўляе сабой горад, напрыклад — «Здаровага ладу жыцця», які мае свайго мэра — звычайна гэта староста класа. Усе старасты разам складаюць парламент. Кожны месяц яны збіраюцца і вызначаюць планы на будучыню. З другога боку, у нас дзейнічаюць і міністэрствы, напрыклад — экалогіі, у міністраў ёсць памочнікі, — распавядаюць «першыя асобы» ільянскай вучнёўскай рэспублікі Алена Кіпель і Наталля Кульгавая.

— А спадар дырэктар як адносіцца да вучнёўскага самакіравання? — пытаюся. — А як не будзеце з ім згодныя...

— Можаце крытыкаваць мяне колькі хочаце... — смяецца Ігар Аляксандравіч.

— Не, ну што вы, дырэктар падтрымлівае нас на сто працэнтаў, калі трэба — прыслухоўваецца. Крытыкаваць няма за што!

Новыя падыходы, наватарскія метады дапамагаюць падтрымліваць высокі ўзровень набыцця ведаў. Летась палова выпускнікоў адзінаццатага класа трапіла ў вядучыя вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. У школе дзейнічае і сістэма інтэграванага навучання — акрамя школьнікаў, з якімі займаецца педагог-дэфектолаг, навучаюцца тут і дзеткі з асаблівасцямі развіцця. Па сістэме, якая прынятая зараз ва ўсіх школах, яны вучацца ў звычайным класе, толькі заданні атрымліваюць індывідуальныя. Як сведчыць практыка, інтэграванае выхаванне, калі да яго ставіцца належным чынам і працаваць з бацькамі, прыносіць станоўчыя вынікі.

І, канешне ж, якасць адукацыі падтрымліваюць педагогі. Некаторыя з іх маюць дзве вышэйшыя адукацыі, у апошнія гады актыўна праводзіцца перападрыхтоўка настаўнікаў у Інстытуце павышэння кваліфікацыі. Як самі яны кажуць і за што ўдзячныя, вялікую падтрымку аказвае Прэзідэнцкая бібліятэка: у школу трапляюць усе новыя метадычныя распрацоўкі і дапаможнікі.

Днямі настаўнікі атрымалі з Прэзідэнцкай бібліятэкі і чарговую «партыю» кніг беларускіх класікаў. А гэта асабліва неабходна, таму што школа беларуская, прадметы выкладаюцца на роднай мове. Дарэчы, да настаўнікаў прыязджаюць і вучоныя педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, прарэктарам якога быў Адам Грымаць.

У школы нават ёсць свой хакейны стадыён, дзе збіраюцца пасля заняткаў усе вучні. Каманда хакеістаў неаднаразова перамагала на абласных і раённых спаборніцтвах. «На каньках стаяць усе: і дзяўчаты, і хлопцы, пачынаючы з самага маленькага ўзросту і да адзінаццацікласнікаў. Мы адзіныя ў раёне, хто не толькі вучыць катацца на каньках, але і пастаянна трэніруе дзяцей. Гэта мае і выхаваўчы эфект. Школьнікі, як і ўсюды, вучацца розныя, ёсць у нас некалькі падлеткаў, якія вылучаюцца не вельмі станоўчымі паводзінамі, розныя ў іх і бацькі... А заняткі на каньках, гульня ў хакей дапамагаюць юнакам. Вольны час дзеці праводзяць на лядовым стадыёне, гэта іх дысцыплінуе і карысна адбіваецца на паводзінах, — распавядае Ігар Юшко. — Увогуле, фізічную культуру ў нашай школе вельмі паважаюць, і гэтая заслуга ў вялікай ступені належыць трэнеру-настаўніку».

Дарэчы, дзякуючы хакейнаму стадыёну, канькі ў мясцовасці з'яўляюцца самым папулярным зімовым відам спорту. Арганізаваць работу пункта пракату спартыўнага зімовага абсталявання, зрабіць падсветку і наладзіць музычнае суправаджэнне лядовага катка — гэтым шляхам школа плануе прыцягваць пазабюджэтныя сродкі. Аднак, на вялікі жаль, каб папулярызаваць лядовы спорт сярод мясцовых жыхароў, магчымасцяў хапіла, а вось на клюшкі для хакейнай каманды грошай няма. Спадзяванні ў Ільянскай школы толькі на спонсараў і аматараў гульні: можа хто даведаецца аб праблеме і дапаможа? А што каманда школьнікаў, якая пакуль «прастойвае» без любімай гульні, і пакуль што катаецца на каньках і трэніруецца на хуткасць перамяшчэння па стадыёне, будзе перамагаць — у гэтым сумненняў няма. Вопыт ёсць!

**Дзмітрый АЛЬФЕР,**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ,**
*Вілейскі раён.*

Абітурыент-2007

# ЦІ НЕ ЗАЛІШНЕ «ПРАВАЗНАЎСТВА»?

## або Якая акадэмія карысталася найбольшай папулярнасцю ў леташняга абітурыента?

**Рэспубліканскі цэнтр прафесійнай арыентацыі моладзі сабраў поўную інфармацыю аб найбольшай папулярнасці і самых высокіх конкурсах у вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах краіны.**

### ВНУ

Летась самымі запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў сталіцы сталі «Дызайн (камунікатыўны дызайн)» у Беларускім дзяржаўным універсітэце — 19,6 чалавека на месца і «Выяўленчае мастацтва. Камп'ютарная графіка» ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка — 16,4. У Мінску, дарэчы, налічылася 65 спецыяльнасцяў, па якіх конкурс перавысіў 5 чалавек. У дзесятку ж увайшлі «Дызайн (дызайн прадметна-пpастоpавых комплексаў) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (12,6), «Акцёрскае майстэрства (драматычнага тэатра і кіно)» (11,6) і «Дызайн камунікатыўны (тэлерэклама)» (10,7) Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, «Псіхалогія. Сацыяльная псіхалогія» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка (9,8), «Сусветная эканоміка» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (9,6), «Сацыяльная работа» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (9,4), «Паліталогія» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (9,3), «Дызайн інтэр'ераў» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (8,8).

Па рэспубліцы з конкурсам звыш 5 чалавек на месца назбіралася 122 спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў краіны, але першыя дзве, мінскія, пазіцыі нікому «абскакаць» не ўдалося. А з трэцяга па дзесятае месца сітуацыя выглядае наступным чынам: «Правазнаўства» Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова (13,3), «Дызайн (дызайн прадметна-прасторавых комплексаў) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (12,6), «Акцёрскае майстэрства (драматычнага тэатра і кіно) Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (11,6), «Лагапедыя. Практычная псіхалогія» Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. Шамякіна (11,6), «Правазнаўства» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна (11,2), «Дызайн камунікатыўны (тэлерэклама)» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (10,7), «Правазнаўства» Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (9,9), «Псіхалогія. Сацыяльная псіхалогія» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

Дарэчы, раней папулярнасць спецыяльнасцяў і ўласна навучальных устаноў сярод абітурыентаў вызначалі лічбы конкурсу, хоць практыка паказвала, што высокі конкурс часта абумоўлены малой колькасцю бюджэтных месцаў. Сёлета спецыялісты цэнтра прафесійнай арыентацыі вырашылі ацаніць папулярнасць з больш аб'ектыўных пазіцый, інакш кажучы, суаднесці конкурсы і планы прыёму. Аказалася, што самымі папулярнымі ў 2006 годзе былі Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь са спецыяльнасцямі «Правазнаўства (спецыялізацыя: судова-пракурорска-следчая дзейнасць)» і «Правазнаўства (спецыялізацыя: аператыўна-вышуковая дзейнасць)». На трэцім месцы — Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт са спецыяльнасцю «Англійская мова і другая замежная мова».

Самыя высокія прахадныя балы назіраліся на спецыяльнасцях «Фінансы і крэдыт (спецыялізацыя: банкаўская справа) Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта — 367 (горад), 243(вёска), «Сусветная эканоміка» — 357 і «Лінгвакраіназнаўства» — 342 (горад), 329 (вёска) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый» — 336, «Фінансы і крэдыт (спецыялізацыя: фінансы і крэдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці)» — 334 (горад), 321 (вёска) Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, «Англійская мова і другая замежная мова» Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта — 334 (горад), 312 (вёска), «Дызайн (камунікатыўны)» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — 41,7 (горад), 36,8 (вёска) з 50, «Французская мова і другая замежная мова» Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта — 333, «Мытная справа» — 333 (горад), 268 (вёска) і «Міжнароднае права» — 331 (горад), 294 (вёска) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

### ССНУ

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах Мінска самы высокі конкурс назіраўся па спецыяльнасцях (на падставе агульнай базавай адукацыі): «Правазнаўства» ў Юрыдычным каледжы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — 17,2 чалавека на месца, «Замежныя мовы» Лінгвагуманітарнага каледжа Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта — 15,8, «Цырульніцкае майстэрства і дэкаратыўная касметыка» ў Мінскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы — 14,3, «Архітэктура» ў Мінскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым каледжы — 14,1.

У гэтай катэгорыі найбольшай папулярнасцю ў абітурыентаў сталіцы і краіны карысталіся спецыяльнасці «Правазнаўства» Юрыдычнага каледжа Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа, «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» Мінскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага каледжа.

Самыя высокія па рэспубліцы прахадныя балы ў гэтай катэгорыі прадэманстравалі такія спецыяльнасці як «Замежныя мовы (нямецкая)» Рэчыцкага дзяржаўнага педагагічнага каледжа — 25,5 (горад), 22,4 (вёска), «Замежныя мовы» Лінгвагуманітарнага каледжа Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта — 25,4, «Сеткі тэлекамунікацый (праграмнае забеспячэнне сетак тэлекамунікацый) Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі (Віцебскі філіял) — 25 (горад), 22,3 (вёска).

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах Мінска (на падставе агульнай сярэдняй адукацыі) конкурс звыш 6 чалавек на месца склаў па такіх спецыяльнасцях як «Замежныя мовы» Лінгвагуманітарнага каледжа Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, «Банкаўская справа», «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль», «Фінансы (бюджэт і бюджэтны ўлік)» Мінскага дзяржаўнага фінансава-эканамічнага каледжа.

Папулярнасцю ў сталіцы вылучаліся найперш спецыяльнасці «Сястрынская справа» ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім каледжы і Мінскім дзяржаўным медыцынскім каледжы, «Фінансы (падаткі і падаткаабкладанне)» у Мінскім дзяржаўным фінансава-эканамічным каледжы.

У рэспубліканскім маштабе першыя тры месцы выглядаюць наступным чынам: «Сястрынская справа» Беларускага дзяржаўнага медыцынскага каледжа, «Лясная гаспадарка» Полацкага дзяржаўнага лясного тэхнікума і «Сястрынская справа» Мінскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа.

Самымі высокімі па краіне прахаднымі баламі вылучыліся тут «Жывапіс (станкавы)» Гомельскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча — 45,3 з 60, «Замежныя мовы» Лінгвагуманітарнага каледжа Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта — 224, «Дызайн» Гомельскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча — 44,8 з 60.

### ПТНУ

22 пазіцыі налічваюць спецыяльнасці прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў сталіцы з прахадным балам звыш 6 (на падставе агульнай базавай адукацыі). На вяршыні аказаліся спецыяльнасці «Касір» (8,6 чалавека на месца) і «Аператар сувязі. Тэлеграфіст» (8) у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы сферы абслугоўвання, «Кандытар» у Дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы хлебапячэння (7,5), «Аператар электронна-вылічальных машын. Аператар прэцызійнай фоталітаграфіі» ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы электронікі (7,1), і «Дражджавод. Фармоўшчык цеста. Цеставод. Машыніст цестаапрацоўчых машын. Пекар» у Дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы хлебапячэння (7).

15 спецыяльнасцяў налічваецца ў спісе прафесійна-тэхнічных устаноў сталіцы з прахадным балам звыш 6 (на падставе агульнай сярэдняй адукацыі). На першых месцах — «Цырульнік. Прадпрымальнік (індывідуальны)» Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя №4 бытавога абслугоўвання насельніцтва (7,7), «Маляр. Тынкоўшчык» Мінскага дзяржаўнага ПТВ № 24 будаўнікоў імя М. Кедышкі (7,5), «Аператар сувязі» Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сферы абслугоўвання (7,4), «Вырабляльнік мясных паўфабрыкатаў. Повар» Мінскага дзяржаўнага ПТВ № 38 перапрацоўчай прамысловасці (7).

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ШКОЛЬНЫ МІНІ-ЗААПАРК

*Школьны сад з чайнымі плантацыямі і экзатычнымі раслінамі — гэта не толькі вучэбна-доследныя і навуковыя даследаванні школьнікаў Залескай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна, але і самасцвярджэнне вучняў. Яны з задавальненнем займаюцца абнаўленнем гатункаў — персікі, абрыкосы і алыча, якія яны атрымалі, не горшыя за паўднёвых сабратоў. Акрамя таго, на прышкольным участку ёсць чатыры вуллі, плантацыя лекавых раслін і свой міні-заапарк. А летась, акрамя рэдкіх паўлінаў і фазанаў, у заапарку з'явіліся і страусы — даўняя мара дырэктара школы Валянціны Еўтушэнка. Яны хуткаператварыліся з птушанят у трохметровых прыгажуноў, якія ў час лірычнага настрою з задавальненнем танцуюць вальс. Палюбавацца на гэта відовішча збіраюцца многія жыхары Залесся.*



**Дырэктар школы Валянціна ЕЎТУШЭНКА і старшакласніцы Жанна РАКІЦКАЯ і Крысціна ГЕРАСІМЕНКА з задавальненнем падкормліваюць сваіх выхаванцаў Жору і Лару.**

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

Пошта: я думаю так

# МОВА НАША — НАШ АНЁЛ

Дзіця — усяму пачатак і ўсяму працяг. А, як вядома, добры пачатак — вечны пачатак. Чалавек вырастае па меры таго, як растуць яго дзеці. Краіна квітнее па меры таго, як расце і развіваецца яе маладое пакаленне, фарміруецца яго патрыятычна-грамадзянскі патэнцыял, адшліфоўваюцца маральна-духоўныя якасці кожнага і ўсіх. У працэсе адраджэння духоўнасці настаўнікам беларускай мовы і літаратуры належыць адна з галоўных роляў, бо яны з'яўляюцца носьбітамі традыцый і культуры беларускага народа, яны праваднікі паміж вучнямі і тымі моўна-літаратурнымі сродкамі, якімі забяспечылі нас нашы продкі.

Мне вельмі пашанцавала, што я вучуся ў гімназіі-каледжы № 24. Менавіта ў гэтай навучальнай установе мне давялося сустрэць сапраўдных настаўнікаў, якія самааддана выконваюць сваю працу. Яны робяць усё магчымае, каб вучням было цікава вывучаць іх прадметы, каб была магчымасць павысіць сваю культуру, інтэлект, духоўнасць.

Асаблівую ўвагу я б хацела спыніць на сваім класным кіраўніку і настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Людміле Аляксандраўне Афанасьевай. Яе добрыя вочы, ласкавы позірк, разумныя парады не адзін раз дапамагалі мне і маім аднакласнікам вырашыць нейкія пытанні і ў вучобе, і ў адносінах паміж сабой. Яна вельмі любіць беларускую мову і аддана стараецца перадаць гэтую любоў нам.

Сваёй задачай настаўнікі нашай установы лічаць не толькі ўзброіць вучняў глыбокімі і трывалымі ведамі, але і сфарміраваць у навучэнцаў духоўна-маральныя якасці, выхаваць патрыятызм, развіць творчае мысленне, пазнавальную актыўнасць, уменне самастойна карыстацца рознымі крыніцамі інфармацыі, арыентавацца ў падзеях сённяшняга дня. Такім чынам, на ўроках яны вучаць і адначасова выхоўваюць, прывіваюць любоў да роднай мовы і культуры.

На нас, і асабліва на моладзь, вельмі моцна ўплывае сённяшні практычны, рацыянальны па сваім характары час, ствараючы дэфіцыт пачуццяў. Гэта прыводзіць да многіх бед, і мы ўсё больш пераконваемся, што чалавек не можа абысціся без душэўнасці і даверу, гневу і спачування, непрымірымасці і міласэрнасці. Павышэнне духоўна-маральнай культуры маладога пакалення — адна з самых надзённых задач настаўнікаў. Народнае, мудрае, спадчыннае — вось што ў першую чаргу дапаможа маладым душам не проста стаць відушчымі, але і надзяліць неацэнным дарам прадбачання, духоўнасці. Чым раней дзіця адчуе непаўторнасць роднай мовы, пачне само ёю карыстацца, тым лягчэй яно будзе ўспрымаць каларыт беларускай культуры. Відавочна, што місія настаўніка беларускай мовы і літаратуры — надзвычай адказная, бо менавіта ён павінен дапамагчы сённяшняму пакаленню маладых беларусаў асэнсаваць сваё месца і прызначэнне ў бясконцым ланцугу быцця народа, далучыць да яго спрадвечных поглядаў на дабро і зло — на ўсё тое, што складае сутнасць нашага этнасу.

Таму мне вельмі прыемна было даведацца, што ў 2006 годзе мой класны кіраўнік і настаўніца беларускай мовы і літаратуры Афанасьева Людміла Аляксандраўна разам з настаўнікамі нашай гімназіі Місуновай Ірынай Міхайлаўнай, Цыркун Таццянай Уладзіміраўнай, Галахавай Кацярынай Аляксандраўнай прыняла ўдзел у праекце «Духоўна-маральнае, патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне асобы сродкамі беларускай мовы і літаратуры» ў рамках праекта «Мы адной табе належым, Беларусь мая!», арганізаванага Камітэтам па адукацыі Цэнтральнага раёна. Вельмі прыемна было даведацца, што настаўнікі нашай гімназіі дастойна абаранілі гэты праект і былі названы лепшымі. За гэтым поспехам стаяць некалькі гадоў неадрыўнай і цяжкай працы. За час падрыхтоўкі настаўнікі беларускай мовы і літаратуры правodзілі сярод дзяцей апытанні, даследавалі каштоўнасці вучняў па наступных крытэрыях: чалавек, сям'я, праца, веды, культура, Айчына, зямля, мір, здароўе. Вывучалі многа спецыяльнай літаратуры.

Мэта праекта — распрацоўка сістэмы работы па выхаванню духоўна-маральнай асобы сродкамі беларускай мовы і літаратуры. «Лёс беларускай мовы карэнным чынам залежыць ад таго, ці стане яна роднай найперш у школе. А для гэтага трэба імкнуцца да таго, каб вучэбная дзейнасць школьнікаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры была для іх асобасна-значнай, а не фармальнай», — такое меркаванне выказала Людміла Аляксандраўна, абараняючы праект.

Настаўніцы — удзельніцы праекта выказалі ў сваёй працы адносіны да роднай краіны і мовы. Напрыклад:

*«Мы жывём у цудоўнай краіне, нам ёсць што шанаваць і любіць, чым ганарыцца» (К.А. Галахава).*

*«Беларуская зямля — захавальніца народа, які тут жыве. Беларускі край — у мінулым шматпакутная і гераічная зямля» (І.М. Місунова).*

*«Мова існавала даўно, а да нас з'явілася ў выглядзе анёла — прасіла памяці, цяпла, шанавання» (Т.У. Цыркун).*

*«Мы, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, у сваёй працы і творчых пошуках ажыццяўляем мары, ідэі, спадзяванні славутых сыноў Айчыны з надзеяй на тое, што побач з імёнамі вялікіх беларусаў мінулага з'явяцца імё-ны цяперашніх адкрывальнікаў нязведанага» (Л.А. Афанасьева).*

І яны не памыляюцца. Творчыя зярняты залатыя прарастаюць у душах іх выхаванцаў. І сведчаннем гэтага з'яўляюцца выдадзеныя зборнікі вершаў Осіка Дзмітрыя, Казлова Рамана, Пронінай Марыі, Борыс Алены, Шаўцова Віктара, Трыч Аляксандры. Усе гэтыя маладыя паэты з'яўляюцца навучэнцамі гімназіі-каледжа № 24. Хочацца пажадаць ім поспехаў, і каб іх імёны ведалі як імёны знакамітых сучасных паэтаў.

**Настасся ХАДАСЕВІЧ, вучаніца МДЛ гімназіі-каледжа № 24, г. Мінск.**

Муз-news

## Жывая легенда з «Яблычным чаем»

**Дзве буйныя гуказапісваючыя кампаніі — расійская MSH-records і беларуская Vigma — падпісалі пратакол аб намерах і паабяцалі з гэтага моманту цесна супрацоўнічаць.**

А каб не быць галаслоўнымі, прадставілі сумесны праект — трыб'ют-прысвячэнне гурту «Deep Purple». (Для даведкі: трыб'ют — зборнік песень выканаўцы або калектыву, перапрацаваных і выкананых іншымі музыкантамі. Ну, а пра легендарнасць і грандыёзнасць самога гурта «Deep Purple» лішні раз казаць не трэба — усе хоць аднойчы чулі ягоныя песні, нават калі не ведалі, што славутая «Smoke on the Water» належыць менавіта яму...).

Першапачаткова планавалася, што ў запісы трыб'юту «Піпл пра/to Purple» возьмуць удзел выключна беларускія калектывы (напрыклад, трыб'ют «Depesh Mode» ў 2002 годзе рабілі 16 знакамітых гуртоў), але паступова з-за розных прычын рамкі праекта пашырыліся, і ў выніку з беларусаў у ім прадстаўлены толькі «Яблычны чай». Затое сярод астатніх удзельнікаў — вядомыя расійскія выканаўцы Аляксандр Маршал, Мікалай Наскоў, Аляксандр Барыкін, Мікалай Фаменка, Яўген Маргуліс, Мікалай Растаргуеў, Сяргей Мазаеў, губернатар Іванаўскай вобласці РФ Міхаіл Мень... Усяго за 2 гады працы над праектам назбіралася 13 трэкаў (у беларускай версіі зборніка іх 14), кожны з якіх зацвярджалі асабіста музыканты «Deep Purple». У выніку рамантыка 70-х у спалучэнні з сучаснасцю прадстаўлена ў лепшым выглядзе. Як мяркуецца, у сакавіку 2007 года пройдзе канцэртны тур у падтрымку трыб'юта, а таксама на бліжэйшы год беларуска-расійская супольнасць плануе «пераспяваць» яшчэ 4 буйныя трыб'юты: Сцінга, «The Doors», «AC/DC» і «Depeshe Mode» (з удзелам фолк-гуртоў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана і нават Тувы). Карацей, рок жывы!..

## Як гучыць «Ідэальная жонка»

**Пра гэта многае можа расказаць беларуская спявачка Вольга Вронская. Бо менавіта яна запісала саундтрэкі да камедыі рэжысёра Уладзіміра Янкоўскага «Ідэальная жонка».**

Песні да гэтай «рамантычнай камедыі з элементамі фантастыкі» напісаў кампазітар Сяргей Ждановіч, ён таксама прапанаваў выканаўцу. Усяго ў фільме прагучыць дзве песні ў выкананні Вронскай — «У горадзе прахожых» і «Ключык залаты». Паводле меркавання рэжысёра, з пастаўленай задачай спявачка справілася на «выдатна».



У будучым песні з фільма будуць выдадзены асобна — але аб гэтым рана меркаваць, бо і сама карціна яшчэ не трапіла на экраны. Уладзімір Янкоўскі пакуль што не раскрывае ўсіх перыпетый сюжэту. Вядома толькі, што інтрыга закручваецца вакол адвечнага «калі б я быў султан і меў трох жонак». Малады, забяспечаны і прыгожы мужчына незадаволены тым, што ў ягонай жонкі не хапае сіл на сям'ю, і пачынае марыць: вось было б у мяне тры жонкі — хатняя гаспадыня, бізнэс-лэдзі і сэкс-бомба... Самае забаўнае, што гэта жаданне раптам здзяйсняецца і жонка з'яўляецца ў трох абліччах. Але ці да лепшага гэта? Даведаемся, калі фільм выйдзе ў пракат..

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Курс на будучую прафесію — са старшай ступені школы

**Беларусь адной з першых краін СНД збіраецца цалкам перавесці старшую ступень агульнаадукацыйнай школы на профільнае навучанне.**

Масавы пераход старшай ступені школы на профільнае навучанне запланаваны на 2008 год. Улічваючы традыцыі і назапашаны ў краіне вопыт па арганізацыі дыферэнцыяванага навучання, а таксама рэальныя магчымасці агульнаадукацыйных устаноў, было вырашана ўвесці ў 11—12-х класах 9 профіляў: фізіка-матэматычны, хіміка-біялагічны, філалагічны (беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, замежная мова), гісторыка-грамадазнаўчы, прыродазнаўча-геаграфічны, інфарматыка-матэматычны, мастацка-эстэтычны, фізкультурна-спартыўны і тэхналагічны. Профільнае навучанне на старшай ступені стане лагічным працягам дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, якія з'яўляюцца ключавымі ў абнаўленні зместу і структуры рэфармуемай беларускай школы.

У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што дадзены пералік зможа задаволіць усе патрэбы старшакласнікаў з улікам іх інтарэсаў, схільнасцяў і прафесійных намераў. Канцэпцыя профільнага навучання старшай ступені 12-гадовай школы праходзіць зараз апрабацыю на базе 18 эксперыментальных школ. На сёння адна з галоўных задач, якія стаяць перад Нацыянальным інстытутам адукацыі, — гэта стварэнне базавай канцэпцыі абавязковага для ўсіх вучэбнага плана, а таксама варыятыўнай мадэлі дадатковых гадзін, якія будуць прапанаваны навучэнцам на выбар. Дарэчы, Нацыянальны інстытут адукацыі сёння ўзначальвае былы дырэктар Ліцэя БДУ Генадзь Пальчык. Тут былі распрацаваныя эксперыментальныя вучэбныя планы, укараненне якіх у вучэбную практыку дазволіла вызваліць суботу для заняткаў па інтарэсах (і гэта на фоне празмернай загружанасці навучэнцаў іншых навучальных устаноў новага тыпу). Сам жа навучальны працэс пабудаваны такім чынам, што асноўны час адводзіцца ў ліцэі на засваенне профільнага прадмета, а няпрофільныя вучэбныя дысцыпліны вывучаюцца модульна-блочным спосабам, што прыводзіць да змяншэння колькасці адначасова вывучаемых прадметаў, але на якасць падрыхтоўкі ніяк не ўплывае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Вецер вандраванняў

# ЭХ, СМАЛЕНСК!..

**— Слухай, Паша, — прыпыніла мяне неяк на факультэцкім калідоры аднакурсніца. — Я хачу сабе лічбавы фотаапарат набыць, а ў Смаленску, кажуць, яны трохі таннейшыя... Паехалі са мной! Га?..**

**— Хм... А ці не холадна ўжо ехаць? Не май месяц на дварэ, — няўпэўнена пытаю Настассю, але ўнутры сябе ўжо адчуваю, як расце жаданне пабыць у новым месцы.**

**— Ды не! З надвор'ем павінна пашанцаваць. Усё, я бачу, што ты згодны, — хуценька лапоча Настасся, каб не даць мне ўставіць слова. — Заўтра еду на вакзал глядзець расклад і цэны!**

**Яна ляпае мяне па плячы, усміхаецца і хуценька збягае ад мяне, мабыць, каб не паспеў перадумаць... А я, дарэчы, перадумваць і не збіраўся. Смаленск? Тэлефаную сваёй дзяўчыне і паведамляю: «На выхадныя едзем у Смаленск!..»**

### КОЛЬКІ І КАЛІ?

Са здзіўленнем я даведаўся, што квіток на цягнік з Мінска ў Смаленск каштуе не даражэй за квіток у які-небудзь беларускі горад — каля трынаццаці тысяч. Шкада толькі — ільготы для студэнтаў не дзейнічаюць, бо едзем у іншую дзяржаву. Выезд з Мінска —у 6.20 раніцы (час мясцовы), прыбыццё ў Смаленск — 11.46 (час маскоўскі). Назад задумалі вярнуцца ўвечары таго ж дня: а сёмай гадзіне выязджаем з Расіі і ўжо а палове адзінаццатай мы будзем на пероне мінскага чыгуначнага вакзала.

Вагон хуткаснага электрацягніка «Мінск—Смаленск» беларускага фарміравання нечым нагадвае звычайную электрычку, але тут больш мяккія сядзенні, ёсць праваднік, а ў суседнім вагоне — буфет. І вось пад размераны грукат колаў мы рухаемся да Смаленска. Трошкі паспалі, трошкі паелі, трошкі пагутарылі. Але вось дзівосы: на мабільніку знікае выява майго апаратара сувязі і застаецца таямнічае «только 112» — усё, спадарства, мы ў Расіі! Гляджу за акно: шэрыя палі ды па-восеньску хмурыя вёскі — здаецца, усё як і ў нас. Ажно не ўсё — у вочы кідаюцца светла-зялёныя слупы, светла-зялёныя станцыі ды светла-зялёныя агароджы. У нас склалася такое ўражанне, быццам, на нейкім буйным складзе ў зялёнай фарбы заканчваўся тэрмін захоўвання і, каб дабро не прападала — у зялёны пафарбавалі ўсё, што толькі можна і няможна, нават будынак чыгуначнага вакзала ў Смаленску.

Дарэчы, пра вакзал: у зале чакання там размешчаны два тэлевізары, а грамадскія туалеты на вакзале... бясплатныя! І, нягледзячы на бясплатнасць, там няма ніякага бруду: чысценька, утульненька і сушылка працуе. Ці не дзівосы?



*Велічны касцёл, які, на жаль, не працуе...*

### ПЕРШЫЯ ЎРАЖАННІ

Смаленск — горад з неверагоднымі кантрастамі. Ён стаіць на сямі ўзгорках, на абодвух берагах Дняпра, там шмат старых будынкаў, не падобных адзін на аднаго, старажытных і велічных цэркваў і храмаў, помнікаў пісьменнікам і дзяржаўным дзеячам, а праз цэнтральную частку горада цягнецца месцамі разруйнаваная смаленская крэпасць (пачатак будаўніцтва — 1596 год). Усё гэта проста вымушае турыстаў разявіць рот і час ад часу прамаўляць з прыдыханнем: «Ух ты!..»

Але ў той самы час Смаленск выглядае брудным і няўтульным. Вуліцы ў большасці не падмецены, шмат смецця, будынкі пашарпаныя і размаляваныя «мастакамі»-графітчыкамі, на дарогах месцамі калдобін болей, чым асфальту, а ў двары лепей і не заглядваць... Толькі зараз я па-сапраўднаму пачаў шанаваць чысціню беларускіх гарадоў, вялікіх і малых...

З цікаўнасцю азіраючыся па баках, заглядваючы ў кожны куточак і мацаючы кожную непрывычную рэч (напрыклад, паштовую скрыню, дзе напісана нязвыклае для нас «Почта России» ды намаляваны арол), раз-пораз тыцкаючы па клавішах мабільніка-калькулятара і пераводзячы рублі ў рублі, мы пачалі шукаць Настассі фотаапарат. Пакуль знайшлі — пакаталіся на смаленскім трамваі (кошт праезду — 5 рублёў). Ільготных квіткоў у Расіі няма, затое ёсць кандуктары з нейкім жудасным надпісам «МУТТП» на спіне і вялізнай мэтанакіраванасцю на збор грошай. На вуліцах адразу кідаецца ў вочы адсутнасць ужо звыклых аўтобусаў МАЗ (па Смаленску гойсаюць «Мерседэсы-гармонікі»), а таксама дарожнай разметкі...



*Чыгуначны вакзал у Смаленску...Зялёны!*

### АСЦЯРОЖНА, ПЕШАХОДНЫ ПЕРАХОД!

Выйшлі мы з трамвая ды спыталі ў нейкай жанчыны, як дабрацца да патрэбнага нам магазіна бытавой тэхнікі. А яна нам не толькі расказала, але і прапанавала паказаць:

— Ой, мне по пути, давайте я вам покажу, здесь недалеко.

Вядома ж, што мы згадзіліся. Ідзём з ёй побач, размаўляем пра Смаленск ды Мінск, падыходзім да пешаходнага перахода і... мы смела ступаем на астаткі ад «зебры», а яна застаецца на тратуары і са здзіўленнем і жахам крычыць нам:

— Куда же вы! Машина!..

Не, не хвалюйцеся. Нас ніхто не збіў, але мы даведаліся, што прапускаць пешаходаў у Смаленску не прынята. А «нахабнаму» пешаходу могуць нават пасігналіць, як зрабіў адзін вадзіла (па-іншаму і не назавеш) джыпа, калі мы пераходзілі дарогу цераз другі пераход.

### ДАРЭЧЫ...

***1145 гадоў таму (862 або 863) з'явіліся першыя летапісныя звесткі аб горадзе Смаленску як адным з цэнтраў крывічаў на старажытным гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» (крывічы — група ўсходніх славян, якая займала тэрыторыю верхняга цячэння Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, паўднёвай часткі басейна Чудскага возера). Быў важным цэнтрам беларускага летапісу — тут створаны Смаленскі летапіс, «Смаленскія граматы 13—14 ст.», Смаленская хроніка, Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. У адпаведнасці з Андросаўскім перамір'ем 1667 года ў складзе Расіі.***

...Вось і спраўдзілася маленькая мара Настассі — яна трымае ў руках доўгачаканы лічбавы фотаапарат, а ў вачах так і свеціцца жаданне пачаць здымаць направа і налева. Эх, шкада, што батарэя не зараджана!..

Але ж рухаем далей, бо мы прыехалі не толькі за фотатэхнікай, але і за ўражаннямі ад новых месцаў. На адной з вуліц мы знайшлі шыльдачку, якая трошкі сагрэла душу (у пераносным сэнсе, не падумайце чаго) — «Белорусское пиво. Разливное, всегда свежее». Натрапілі нават на стары касцёл з чырвонай цэглы... Велічны, з дзвюма вежамі, якія нібы цягнуцца да нябёсаў. Абышлі яго з усіх бакоў і са шкадаваннем адзначылі, што ён не працуе, а прыступкі параднага ўвахода зараслі пустазеллем...

Сагрэўшыся ды набраўшыся моцы, мы рушылі далей, недзе ў напрамку вакзала. Па дарозе напаткалі музей смаленскага лёну, які размясціўся ў нейкім царкоўным будынку, а потым перад намі выплыў Богаяўленскі сабор — галоўная славутасць Смаленска па меркаванню жыхароў горада. Храм вялікі, зноў жа — зялёнага колеру, шыкоўна адрамантаваны (відаць, што грошай не пашкадавалі), з багатым аздабленнем унутры... А пабудаваны ён, дарэчы, у гонар гераічнай абароны Смаленска ў 1609—1611 гадах ад... палякаў — гэта значыць, ад войскаў Рэчы Паспалітай. «Упорнымъ сопротивленіемъ смоленскъ задержалъ поляковъ, далъ возможность собраться всей земской Руси и темъ спасъ Москву и все государствовъ смутную пору» — распавядае шыльда на саборы. Вось так звязаны ў вузел лёсы нашых зямель: уваходзіў Смаленск у склад Вялікага княства Літоўскага больш за стагоддзе (з 1404 па 1514 год), а яшчэ праз стагоддзе ўжо абараняўся ад былых сваіх землякоў...

### ЭПІЛОГ

Да вакзала мы дабраліся ўжо прыцемкам. На апошнія расійскія рублі набылі ў буфеце гарачай гарбаты ў пластыкавых шклянках ды булачак. Паглядзелі тэлевізар у зале чакання і пайшлі шукаць цягнік на Радзіму. Эх, як добра-такі вяртацца дамоў! «Свая хатка як родная матка» —слушна кажа народная мудрасць.

А Смаленск мы вырашылі наведаць яшчэ летам ці вясною. Калі будзе сонца і блакітныя нябёсы, калі можна будзе пахадзіць па горадзе без страху прастудзіцца. Напэўна ж, прыгожа глядзяцца сем узгоркаў у вопратцы зялёных дрэў... Праверым? Канешне!..

**Павел БЕРАСНЕЎ, фота аўтара.**

## Тыя, што нас берагуць

# БЕРАЖЫ ВАС БОГ І ПОЛЫМЯ СВЕЧКІ!

У гадавым цыкле ёсць святы, час святкавання якіх застаецца пакуль што не да канца зразумелым і патлумачаным. Да такіх каляндарных загадак адносіцца святкаванне Грамніц (царкоўная назва свята — Стрэчанне) 15 лютага.

Хутчэй за ўсё ў даным выпадку спрацаваў прыродны феномен: задоўга да таго, як Пярун пачне паласаваць неба сваімі сярэбранымі або залатымі стрэламі, чалавек здалёк пачуе папераджальныя грымоты. Гром-Грамаўнік імчаў наперад калясніцы Перуна і абвяшчаў людзям: сцеражыцеся, маліцеся, прымайце адпаведныя захады, зрабіце ўсё неабходнае, каб захаваць сваё жытло і сядзібу! Відаць, менавіта таму славянскія народы з асаблівай пашанай ставіліся да моманту **першага грому** ў новым годзе. Ён **быў** своеасаблівым **прадказальнікам будучага ўраджаю** і, адпаведна, дабрабыту сям'і, а таксама **здароўя чалавека**. Існавала прадказанне: «Калі гром грыміць на зялёны лісток, то будзе багаты гадок» і, наадварот, калі гром прагрыміць на «голы» лес — год будзе галодны. Пачуўшы першы гром, чалавек павінен быў выканаць некаторыя рытуальныя дзеянні: стаць спінай да дуба; тройчы перакуліцца цераз галаву або проста пакачацца па зямлі, каб на працягу года не балела спіна.

### Чаму Грамніцы святкуюць зімой?

Тое, пра што будзе сказана ніжэй — гэта толькі спроба першага набліжэння да вызначэння дахрысціянскага месца Грамніц у структуры традыцыйнага календара беларусаў. У кнізе «Зімовыя святы» мы выказалі меркаванне аб тым, што нягледзячы на паэтычную асэнсаванасць часу святкавання Грамніц у шэрагу прыказак і прымавак, усё ж сучаснага чалавека здзіўляе, чаму свята ўшанавання Іллі Грамавержца адзначаецца летам (2 жніўня), а яго папярэдніка — уладара нябёсаў Перуна — Грамаўніка — усходнія славяне славяць 15 лютага? Што гэта — парадокс, часавы алагізм або вынік націску хрысціянскай традыцыі?

Пакуль што зразумела толькі адно: сучасная дата святкавання Грамніц напрыканцы зімы — з'ява вельмі позняя і цалкам суадносіцца з хрысціянскай традыцыяй (якая, у сваю чаргу, абапіраецца на традыцыю старажытных іудзеяў), прыносіць немаўля ў храм на саракавы дзень пасля нараджэння. Тое ж самае датычылася і маці-рожаніцы: толькі праз сорак дзён яна атрымлівала права прайсці абрад ачышчэння і далучэння да царквы. Ад Раства Хрыстова да Стрэчання (царкоўна-славянская назва Сретенье) — якраз роўна 40 дзён.

У народным асяроддзі гэта знакамітая і лёсавызначальная падзея была асэнсавана па-свойму, атрымала дадатковае адценне і стала ўспрымацца як прыродна-касмічнае «Стрэчанне» — сустрэча зімы з вясною. Тыя звесткі, якія дайшлі да нас у запісах збіральнікаў этнафальклорнай спадчыны, сведчаць пра тое, што знакавай пазіцыяй у веснавым колабегу часу быў першы гром. Аднак у сувязі з тым, што гэтая з'ява мела лакальны характар і розначасовую прымеркаванасць, то ёй спадарожнічалі індывідуальныя рытуальныя дзеянні. Аднак, думаецца, усё ж у беларусаў было агульнародавае, абшчыннае свята веснавога ўшанавання Грома-Перуна. Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца абрад «Страла» (або «Ваджэнне і пахаванне стралы»), які лакалізаваўся ў паўднёва-ўсходняй частцы Усходняга Палесся з эпіцэнтрам у Веткаўскім раёне і выконваецца на саракавы дзень пасля Вялікадня — на Ушэсце. Гэты рытуальна-абрадавы комплекс мае ўсе неабходныя састаўляючыя, якія звязаны з культам Перуна і пазнейшым хрысціянскім напластаваннем. Жанчыны-ахоўніцы Роду і захавальніцы хатняга ачага, узяўшыся за рукі, дакладней — пераплёўшы іх у «вяроўку», «выводзілі» «Стралу-маланку» за вёску. На ўскрайку жытнёвага поля яны «хавалі» бліскавіцу. Зараз яе замяняе пучок жытнёвых каласоў (тая ж страла), манета, любы бліскучы прадмет і г. д.

**З прыходам хрысціянства ролю «стралы» пачала выконваць свечка**, якая заняла ключавое месца ў пачатковай фазе святкавання Ушэсця і «Ваджэння стралы», а месцам яе асвячэння стаў храм. Заслугоўвае ўвагі і той факт, што ў абрадзе Грамніц, апісаным вядомым этнографам М.Я. Нікіфароўскім, свечкі, прынесеныя людзьмі ў царкву, складвалі ў адно месца (быццам, у адзінае «дрэва», якое пасля асвячэння трэба было падзяліць на «свечкі-лучыны»), праводзілі спецыяльны абрад сабornага паяднання, абшчыннай узаемаспалучанасці, пасля якога **грамніца** надзялялася статусам касмічнай або Боскай пазначанасці, набывала функцыі абярэга, амулета, талісмана.

*(Працяг будзе.)*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Рамантыкам, скептыкам і аматарам вострых адчуванняў...

5 лютага на канале «ЛАД» — прэм'ера адразу чатырох серыялаў: дзве меладрамы «Гарадскі раманс» і «Любоўныя авантуры», камедыя «Залатая цешча» і вострасюжэтны фільм «Двое з куфэрка».

**«Гарадскі раманс»** (Расія—Украіна, 2006), паводле задумкі рэжысёра Уладзіміра Дз'ячэнкі — гісторыя выпрабавання пачуццяў праз доўгія расстанні і нечаканыя сустрэчы. Сюжэт пра каханне, і без таго запатрабаваны ва ўсе часы, «прыпраўлены» вядомымі акцёрамі (Івар Калныньш, Валянціна Талызіна, Міхаіл Дарожкін, Валянцін Смірніцкі, Дар'я Паверанава) і прыгожымі, запамінальнымі ландшафтамі расійскай і ўкраінскай сталіц (Васільеўскі спуск, Вараб'ёвы горы, Кацельніцкая набярэжная).

Камедыйны серыял **«Залатая цешча»** (Расія, 2006) прысвечаны галоўнай жанчыне, якая ёсць у жыцці амаль кожнага мужчыны. Праўда, гэты гумар выключна айчынны, бо за мяжой цешча — проста мама жонкі, а не гераіня сучаснага народнага эпасу. Дарэчы, большая частка камічных сітуацый адбываецца якраз з-за таго, што цешча — простая руская жанчына, гатовая і з канём, і з агнём справіцца — сутыкаецца з «еўрапейскімі» замашкамі зяця. У галоўнай ролі, між іншым, беларуская актрыса Эвеліна Сакура, а дапаўняюць акцёрскі ансамбль Алена Кавальчук, Уладзімір Цішко, Вераніка Лысакова, Цімур Керымаў.



Рэжысёрская работа Ігара Мужухіна **«Двое з куфэрка»** (Расія, 2006) — гэта экранізацыя адразу шасці кніг аўтара папулярных дэтэктываў Уладзіміра Балучэўскага. Двое сяброў — незалежны журналіст з дваранскімі каранямі ў прозвішчы і прыватны дэтэктыў, былы аператыўнік у стылі Рэмба, — ідуць па жыцці разам і выбіраюцца з такіх небяспечных спраў, што ні ў казцы сказаць, ні напісаць — толькі па тэлевізары і глядзець. У фільме занятыя акцёры Уладзімір Епіфанцаў, Андрэй Зіброў, Сяргей Селін, Яўген Мяркур'еў і г.д.

Меладрама **«Любоўныя авантуры»** (Расія, 2004) — па сутнасці, серыял з шасці навел. Шасцёра сяброў, якія далі клятву ніколі не жаніцца, збіраюцца па вечарах разам і расказваюць гісторыі пра свае любоўныя прыгоды. Кожная серыя, адпаведна, названа жаночым імем: «Алума», «Мадлен», «Анрыета», «Анэта», «Мары» і «Івета». Гульню акцёраў (Антон Макарскі, Алег Каменшчыкаў, Сяргей Астахаў, Арсеній Кавальскі, Андрэй Кузняцоў, Эўклід Кюрдзідзіс) рэжысёр сумясціў з камп'ютарнай графікай, а дэкарацыі наўмысна стылізаваў «пад старажытнасць». Словам, амаль што тонкі намёк на «Дэкамерон»...

Глядзець ці не, а калі глядзець, то што менавіта — як звычайна, вырашаць вам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.55 | 16.52 | 8.57 |
| Віцебск — | 7.50 | 16.36 | 8.46 |
| Магілёў — | 7.46 | 16.42 | 8.56 |
| Гомель — | 7.37 | 16.44 | 9.07 |
| Гродна — | 8.09 | 17.08 | 8.59 |
| Брэст — | 8.05 | 17.14 | 9.09 |

### Месяц

*Поўня ў 7.46*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

**Пр.** *Рымы, Яфіма.*
**К.** *ГРАМНІЦЫ (АХВЯРАВАННЕ ПАНА), Марыі, Аскара, Карнеля, Міраслава.*

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +3 — +5 °С | |
| ВІЛЬНЮС | 0 — +2 °С | |
| КІЕЎ | -6 — -4 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | -8 — -6 °С | Без ападкаў |
| РЫГА | -1 — +1 °С | |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -4 — -2 °С | |

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛЮТЫМ

3, субота 10.00—13.00
5, панядзелак 21.30—24.00
6, аўторак 0.00—2.00
8, чацвер 10.30—14.00
10, субота 11.30—23.00
11, нядзеля 0.00—2.00
13, аўторак 9.00—11.00
15, чацвер 2.30—15.30
17, субота 15.00—17.30
19, панядзелак 15.30—18.00
21, серада 16.30—19.00
23, пятніца 18.30—21.30
26, панядзелак 0.00—3.00
27, аўторак 6.00—23.30
28, серада 0.00—10.30



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Дзве даты — 2 лютага

**1677 год** — нарадзіўся Людвік Сяніцкі, беларускі падарожнік, мемуарыст, даследчык. З беларускага шляхецкага роду герба «Бонча». На пачатку XVIII стагоддзя з'яўляўся адміністратарам Магілёўскай эканоміі. У час Паўночнай вайны — адзін з кіраўнікоў абароны Быхава. Аўтар мемуараў «Дакумент асаблівай міласэрнасці Божай».



**1943 год** — завершаны разгром нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам. Сталінградская бітва — адна з найбуйнейшых у Другой сусветнай вайне, яна працягвалася 200 дзён. Фашысцкі блок страціў падчас яе каля 1,5 млн чалавек (забітымі, палоннымі, што прапалі без вестак) — чвэрць усіх сваіх сіл, якія дзейнічалі на усходнім фронце.

## Цытата дня:

**«Заўсёды будзьце асабліва ветлівымі і ўважлівымі да маладзейшых за вас: менавіта яны ў будучым напішуць пра вас».**

**Сірыл Коннаі (1903—1974), англійскі крытык.**

# Inter-ПОЛ

## КРЫК ДЗІЦЯЦІ ЗАБІЎ... КУРЭЙ

**На ўсходзе Кітая чатырохгадовы хлопчык, напужаны сабакам, забіў сваім крыкам 400 курэй. Суд прымусіў бацьку дзіцяці заплаціць за загінулых птушак штраф.**

Сотні куранят былі знойдзены мёртвымі на ферме. Дзіўныя падзеі адбыліся, калі ў вёску прыехаў 4-гадовы хлопчык разам з бацькам, які прадаваў балоны з газам мясцовым жыхарам. Пакуль той займаўся справамі, яго сын, напужаны брэхам сабакі, высунуўся ў акно дома, размешчанага побач з куратнікам, і доўга крычаў ад страху. Пасля гэтага дзіця і яго бацька з'ехалі. Пазней мясцовыя жыхары сцвярджалі, што чулі крык хлопчыка менавіта ў той дзень, калі загінулі куры. Разбірацца ў гэтай гісторыі давялося суду, які пастанавіў, што крык хлопчыка быў «адзіным нечаканым і пужаючым гукам», які прымусіў 443 куранят панікаваць. Спужаўшыся, яны проста затапталі адзін аднаго. Суд прызначыў бацьку дзіцяці штраф у 230 долараў. Гэтыя грошы ён павінен будзе выплаціць гаспадару загінулых курэй.

## ЭЛЕКТРЫЧНЫ ШАНТАЖ

**Высокапастаўленага супрацоўніка Электрычнай кампаніі Ізраіля затрымалі па падазрэнню ў выкарыстанні сваёй пасады для прымушэння жанчын-спажывальнікаў электраэнергіі да сэксу, паведамляе MIGnews.**

Паводле папярэдніх даных, мужчына, выкарыстоўваючы доступ да камп'ютарных сетак сваёй кампаніі, адключаў святло тым спадарыням, якія адмаўлялі яму ў пяшчоце. Адна з пацярпелых расказала, што ў яе офісе ў гадзіны пік стала адключацца электрычнасць адразу пасля таго, як яна адвергла прапановы шчадралюбнага чалавека з рубільнікам правесці тры гадзіны ў пацехах. Затым святло пачало адключацца і ў яе дома. Яна прыйшла ў электрычную кампанію, дзе даведалася, што незадачлівы кавалер прыпісаў ёй доўг па аплаце паслуг у памеры каля 6 тысяч долараў. Пасля гэтага жанчына паскардзілася ў паліцыю, дзе да яе слоў аднесліся з разуменнем і прыступілі да расследавання.

## ПАЛІЦЫЯ ЗАЗІРНЕ ПАД АДЗЕННЕ

**Брытанскія ўлады плануюць устанавіць на вуліцах рэнтгенаўскія камеры, з дапамогай якіх можна будзе выяўляць падазроных у тэрарызме.**

У распараджэнні таблоіда The Sun апынуўся службовы дакумент, які датыраваны 17 студзеня. У ім гаворыцца аб планах выкарыстоўваць тэхналогіі, якія апрабаваны ў аэрапортах, што дазволіць аблегчыць пошук зброі і выбуховых рэчываў. Разам з тым у дакуменце гаворыцца пра заклапочанасць грамадскай рэакцыяй на новаўвядзенне, паколькі яно дазваляе паліцэйскім бачыць, што ў людзей знаходзіцца пад адзеннем. У якасці адной з мераў прапаноўваецца, каб за жанчынамі сачылі толькі жанчыны-паліцэйскія. У той жа час у дакуменце адзначаецца, што пры назіранні за вялікім натоўпам людзей прытрымлівацца прынцыпу «жанчыны сочаць за жанчынамі» будзе «вельмі праблематычна».

## ЗЛОДЗЕЙ ПРАХОДЗІЦЬ ПРАЗ СЦЕНЫ

**Паліцыя амерыканскага штата Джорджыя расшуквае ўзломшчыка, які пранікае ў дамы праз сцены.**

За апошнія некалькі месяцаў у акрузе Коб, гарадах Акворт, Кенесо і ў іх наваколлі было зафіксавана больш за дзесяць крадзяжоў, пры ўчыненні якіх узломшчык пранікаў у дамы не праз дзверы ці вокны, як гэта звычайна адбываецца, а праз сценку, робячы ў ёй адтуліну. Такім чынам ён мог спакойна вынесці з дому ўсё каштоўнае, не прыводзячы ў дзеянне ахоўную сігналізацыю. «Мы мяркуем, што размова ідзе пра чалавека, які валодае пэўнымі ведамі аб канструкцыі дамоў, пра гэта сведчыць размяшчэнне адтулін, праз якія ён пранікаў», — заявіў прадстаўнік паліцыі.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

## Стратэгія нацыянальнай культуры — развіццё духоўнасці грамадства

**Учора ў памяшканні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, на якім была прааналізавана работа ведамства ў мінулым годзе і акрэслены новыя задачы.**

З грунтоўным дакладам выступіў міністр культуры краіны Уладзімір Мацвяйчук. Задачы перад галіной пастаўлены канкрэтныя і ў плане развіцця бібліятэчнай справы (дарэчы, чытачамі Нацыянальнай бібліятэкі ўжо сталі больш як 45 тысяч чалавек), і захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця нацыянальнай драматургіі, размеркавання выпускнікоў галіновых ВНУ (большая частка з іх пакуль «асядае» ў сталіцы), павышэння заработнай платы, аказання платных паслуг... Асаблівую ўвагу Уладзімір Мацвяйчук звярнуў на неабходнасць дакладна арганізаваць работу па энергазберажэнню: «Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка невыпадкова назваў энергабяспеку найважнейшым пытаннем нацыянальнай бяспекі».

У зацікаўленай размове калегіі ўдзельнічалі работнікі культуры з усёй краіны. У рабоце калегіі Мінкультуры браў удзел і віцэ-прэм'ер Беларусі Аляксандр Косінец.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

## ДЫПЛОМ НА СЦЕНКУ, ЯКАСЦЬ — НА ЭКРАН

**Залаты медаль і дыплом пераможцы — з такімі набыткамі выйшаў Першы тэлеканал з 6-га Нацыянальнага конкурсу «Брэнд года 2006».**

Сёлета ў «Брэндзе года» за званне лепшага спаборнічалі 65 брэндаў у 33 таварных групах. 49 кампаній падалі заяўкі на прафесійныя намінацыі, якія строга і прынцыпова ацэньвала міжнароднае журы. У выніку ў прафесійнай намінацыі Першы тэлеканал узяў «золата» — за індывідуальнасць вобраза, пераемнасць і захоўванне лепшых традыцый папярэдніка (Першага нацыянальнага канала), паспяховую папулярызацыю брэнда і г.д. Акрамя таго, лідарам у спажывецкай намінацыі ў таварнай групе «Радыёканалы» стала яшчэ адно структурнае падраздзяленне Белтэлерадыёкампаніі — станцыя «Радыус-FM».

Дарэчы, як паведамілі ў прэс-службе БТРК, за мінулы год творчыя праекты і калектывы кампаніі былі прадстаўлены амаль на дзесятку розных нацыянальных і міжнародных конкурсаў, сярод якіх — тэлевізійны прафесійны конкурс «Тэлевяршыня», міжнародны кінафорум «Залаты віцязь», Міжнародны незалежны кінафестываль у Лос-Анджэлесе, фестываль «Перамаглі разам» і г.д.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ВАША ДОЛЯ НА КАРЦЕ НАЧНОГА НЕБА,

## або Космас і народны каляндар: сакрэты суіснавання

**Для многіх пакаленняў людзей неба было не толькі месцам знаходжання Сонца і Месяца, безлічы зорак, але яшчэ і своеасаблівай картай, якая прадвызначала лёс чалавека, уплывала на яго долю, была надзейным дарадцам у гаспадарчай дзейнасці. Аднак даўняя славянская традыцыя сцвярджае: 5 лютага ў неба лепш не глядзець! Нечакана можна ўбачыць тое, пра што лепш не ведаць. Чым жа можна патлумачыць такое папярэджанне?**

Дзіўная і пакуль што не спазнаная рэч — гэтыя Нябёсы. У адзін дзень мы з нецярплівасцю глядзім у начное неба і чакаем узыходу першай зоркі, каб распачаць святочную вячэру. У купальскую раніцу мы з незразумелым хваляваннем будзем чакаць моманту ўзыходу сонца, якое, дасягнуўшы найвышэйшага росквіту, будзе так радавацца свайму ўладарству, што яму захочацца «паіграць» — «пакупацца» ў той вадзе, у якой Іван Хрысціцель некалі пакупаў-пахрысціў Ісуса Хрыста.

Але разам з тым прыходзіць **5 лютага** і народная традыцыя задае зусім іншае правіла нашых паводзінаў. Яна сцвярджае, што **ў гэты дзень**, асабліва ноччу, зусім **не пажадана глядзець на зоркі — нечакана для сябе вы можаце «прачытаць» самую таямнічую інфармацыю — прадказанне аб смерці, сваёй або вашых родных і блізкіх**. У чым тут справа?

Чым з усяго календара вылучаўся дзень 5 лютага? Што ў гэты дзень здаралася з небам?

Аказваецца, 5 лютага неба выдавала чалавеку тайную інфармацыю аб яго далейшым лёсе. Аднак у сувязі з тым, што некалі Бог забараніў чалавеку ведаць дзень сваёй смерці, то, адпаведна, ён жа забараніў людзям глядзець у неба і спрабаваць чытаць касмаграму свайго жыццёвага шляху, таму што знічка (зорка, якая падае і знікае з начной бездані) «азначае перадсмяротны ўздых якога-небудзь чалавека».

* Калі на небе згасала зорка, то казалі, што «анёл за душой памерлага паляцеў». Калі ў гэты момант загадаць сваё жаданне, яно абавязкова спраўдзіцца, таму што ў гэтую хвіліну анёлы не могуць ні ў чым адмовіць. Па хрысціянскіх уяўленнях лічыцца, што да хрышчэння дзіця пазбаўлена душы, а значыць, не мае свайго анёла-ахоўніка. (Ці не таму па народных уяўленнях дзіця патрабавалася ахрысціць як мага раней?).

Лічылася, што 5 лютага на Агафоніка, як і на Льва Катаніка (5 сакавіка), **нельга глядзець на знічкі:** гэта дрэнная прыкмета, якая прадказвала хуткую смерць. Паводле павер'яў славян, кожны чалавек мае на небе сваю зорку. Пра зляцелую з нябёс зорку казалі: «Чыясьці душа закацілася», хрысціліся і казалі: «Царства нябеснае!»

Сярод традыцыйных уяўленняў славянскіх народаў аб пабудове свету важнае месца займалі спосабы і сродкі атрымання інфармацыі аб смерці чалавека. Такім прадказаннем маглі стаць самыя розныя рэчы ці непрадбачаныя на першы погляд з'явы:

* лічылася, калі чалавек дакладна чуў, як яго паклікалі па імені, але пры гэтым не бачыў таго, хто яго клікаў, то гэта душы продкаў даюць знак збірацца да іх;

* прадказаннем хуткай смерці лічыўся сон, у якім чалавека клічуць «да сябе» памерлыя раней сваякі ці знаёмыя;

* сон, у якім у чалавека выпадае зуб з крывёю, прадказваў пахаванне ў хаце, калі зуб вывальваўся без крыві — у далёкай радаводнай галіне;

* сон, у якім пераходзіш цераз мост, у народных сонніках трактуецца як пераход у іншы свет;

* хуткую смерць маглі прадказваць паводзіны лясных птушак (вароны, савы, філіна), якія залятаў у вёску. Калі птушка садзілася на страху хаты, чакалі смерці гаспадара; калі на страху хлява — гаспадыні; калі яна села на дрэва ці царкву (нічыё месца), чакалі мор, эпідэмію ці іншыя нястачы, у выніку якіх можа пацярпець вялікая колькасць людзей;

* смерць сваякоў прадказвала і заляцеўшая ў сад зязюля;

* калі птушка (часцей за ўсё ластаўка або сінічка) рэзка стукне ў аконную шыбу ці заляціць у хату — чакалі смерці сярод самай блізкай радні;

* лічылася, калі моцным ветрам знясе дах ці расколецца бэлька («падгнётны вянец»), памрэ гаспадар хаты; калі расколецца печ — гаспадыня;



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

* полымя ў печы не гасілі, уначы захоўвалі вугельчыкі, прыкрытыя попелам. Калі раніцай бачылі, што полымя згасла, чакалі няшчасця ў хаце — смерці самага блізкага чалавека;

* меркавалі: калі стол пачаў хістацца, то хутка памрэ гаспадар хаты;

* калі на толькі што засланым абрусе пасярэдзіне ўтваралася складка ў выглядзе ромба, таксама чакалі самага дрэннага;

* прадказаннем смерці быў і нечакана разбіты ў хаце абраз; калі абраз падаў са сцяны або на ім трэснула шкло, то гэта таксама прадказвала смерць аднаго з дамачадцаў, прычым вельмі хуткую. Калі з якой-небудзь нагоды абраз выносілі з хаты, то гэта магло прадказваць выміранне ўсяго роду; калі дом прадавалі чужым людзям, тады абразы забіралі з сабой у новае жытло;

* прадвесцем смерці было і тое, калі ў хаце што-небудзь разбівалася на Вялікдзень;

* калі разбілася або трэснула люстэрка (а яно лічылася атрыбутам своеасаблівай мяжы паміж светам жывых і «светам» памерлых), то гэта таксама выклікала пэўную занепакоенасць гаспадароў хаты;

* калі ў садзе пачала сохнуць яблыня, казалі, што ў сям'і памрэ нехта па мужчынскай лініі і перш за ўсё гаспадар; выраз «зямля яблыкам пахне» сведчыў якраз пра гэтыя падзеі;

* сабака доўга вые, апусціўшы галаву да зямлі, ці вырыў у садзе вялікую яміну — чакай няшчасця;

* прадказаннем смерці было і тое, калі з вулля вылецеў рой і сеў на сухую галіну дрэва;

* калі чалавек чуў, як нехта гучна і няспешна тройчы пастукаў у дзверы ці акно або па ложку, на якім ляжаў хворы чалавек, то лічылі, што ён хутка сканае;

* знакамі хуткай смерці былі наступныя прыкметы: калі сабака не есць рэшткі пасля цяжка хворага чалавека; калі ў пакой да хворага заляцеў матылёк; калі кошка пайшла з хаты і не вярнулася, то гэта было знакам таго, што хворы чалавек не адолее бяду;

У народзе казалі: «Бяда адна не ходзіць, за сабой другую водзіць, а за ёю трэцяя брыдзе». Прыметамі яшчэ адной смерці лічылася:

* калі труна для памерлага зроблена не па яго памерах (малая ці вялікая);

* калі ногі памерлага доўгі час застаюцца цёплымі;

* калі чалавек памёр з адкрытымі вачамі;

* калі гадзіннік б'е адначасова з пахавальным звонам;

* калі ў сям'і памерлі ў адзін год два чалавекі, быць і трэцяй труне ў сям'і ці родзе.

**Замова ад боязі смерці**

Ёсць людзі, якія вельмі пакутуюць з-за свайго страху смерці, марнеюць яны самі і іх родныя. Каб пазбавіць іх ад гэтага, трэба ўзяць тры шчэпаці шэрага маку, замовіць яго на збыта і абсыпаць галаву гэтага чалавека:

*«Анёл мой зямны, будзь са мной, Божай рабой (імя). Здымі страх смерці зброей вечнага жыцця, імем Бога. Амін».*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## УСМІХНЁМСЯ!

— А памятаеце, як мы ў чужы сад за яблыкамі хадзілі? Набярэш, бывала, поўныя ягадзіцы солі, прыйдзеш дадому, ляжыш на жываце і думаеш: «Божухна, ну што ж я так фрукты люблю?..»

☺

**Канструктары ВАЗа распрацавалі 6-месны аўтамабіль. Дадатковае месца будзе прызначана для аўтаслесара.**

☺

Здымкі рэкламнага роліка. Рэжысёр тлумачыць актрысе, што пасля слоў «зубная паста «32 норма» зберажэ вашы зубы моцнымі і здаровымі надоўга» трэба будзе шырока-шырока ўсміхнуцца, каб былі бачныя ўсе зубы.

— Зразумела? Паехалі! Зубная паста «32 норма» зберажэ вашы зубы моцнымі і здаровымі надоўга!.. Дзяўчына! Дзяўчына!!! Стоп, камера! Дзяўчына, скажыце, навошта вы вачыма вось ТАК робіце??!!

— Лічу, ці ўсе 32 бачна...

☺

**Доктар:**

**— Пацыент, а вось ваш зуб!**

**Хворы:**

**— Так?.. Дзякуй, доктар, а вось ваша ручка ад крэсла...**

☺

Мяне не засмуціла вашае пытанне, я проста не ведаю, як вам лепш урэзаць.

## ЛЕПШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАШТОЎКА

**У рэспубліканскім конкурсе на лепшую беларускую паштоўку сярод мастакоў-графікаў, дызайнераў, навучальных устаноў і творчых саюзаў узялі ўдзел 77 аўтараў (205 паштовак) з розных рэгіёнаў рэспублікі.**

У намінацыі «Віншавальная паштоўка» пераможцам стала Ксенія Алісвяк з Віцебска, «Мастацкая паштоўка» — Аляксандр Грышкевіч з Мінска, «Рэлігійная паштоўка» — Аляксандр Зінкевіч, г. Мінск, «Сувенірная паштоўка» — мінчанка Дар'я Букаціна.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства кирпичного гаража (об. пл. 24,2 кв.м), по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, ГК «Автогарант», блок № 1, гараж № 54. Начальная цена — 2 000 000 бел. руб. Размер задатка составляет 10% от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за объект производится в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 07 марта 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 06 марта 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

ВНИМАНИЕ!

РУП «Белпочта» с 1 по 28 февраля 2007 года проводит опрос-конкурс «Лучшая почтовая марка Республики Беларусь 2006».

Посетитв любое отделение почтовой связи, вы сможете ознакомиться с условиями конкурса и заполнить анкету. Вашу анкету с решением о лучшей марке 2006 года направляйте по адресу:

Издатцентр «Марка» РУП «Белпочта»
пр-т Независимости, 10, 220050, Минск
с пометкой: Конкурс «Лучшая марка»

Победители конкурса буду награждены памятными призами.

БЕЛПОШТА

Справки по телефону: 206-59-19

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА НА АУКЦИОНЕ

aquabel INTERNATIONAL EXHIBITION CENTER

ЗАО «ВЦ» АКВАБЕЛ» Минский район проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:

| № лота | Наименование объекта недвижимости | Общая площадь, м кв. | Начальная цена с НДС, бел.руб. | Адрес объекта |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Телятник | 493,4 | 444 304 762 | Минский район, район д. Королев Стан |

Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанка» МГД г. Минск, ул. Ольшевского 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 9 февраля 2007 г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.02.2007 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости.

Контактный телефон: (8-017) 237-93-93.

# Баклажаны

**У гэтым сезоне ААТ «МінскСортНасенАгародніна» прапануе вам наступныя сарты баклажанаў:**

| Сорт | Характарыстыкі |
|---|---|
| «Алмаз» | Сярэдняспелы. Расліны 45—55 см. Плады цыліндрычныя, даўжыня — 14— 18 см, дасягаюць масы 210—240 г. Выдатныя смакавыя і тэхналагічныя якасці. |
| «Вэратик» | Ранні. Вышыня раслін дасягае 50—60 см. Плады грушападобныя ці цыліндрычныя, масай 180—200 г, з выдатнымі смакавымі якасцямі. |
| «Длинный пурпурный» | Сярэдняранні. Вышыня 55—65 см. Плады падоўжана-цыліндрычныя, даўжыня18—22 см, масай 180—200 г. Мякаць шчыльная, без горычы. |
| «Пинг-понг F1» | Сярэдняранні гібрыд. Вышыня 60—70 см. Плады яйкападобныя, белыя, масай 50—70 г. Мякаць далікатная, без горычы. |
| «Черный красавец» | Сярэдняранні. Вышыня раслін — 55—65 см. Плады авальна-круглыя, масай 190—220 г, чорна-фіялетавыя. Без горычы. |



Баклажаны трэба вырошчваць на высокаўрадлівых, багатых арганікай, лёгкіх глебах, на добра асвечаных, захаваных ад ветру ўчастках. Працяглая спёка (вышэй за 30°) ці пахаладанне прыводзяць да прыгнечання раслін, ападання кветак і завязі. Найлепшыя папярэднікі — капуста, бабовыя, морква, цыбуля, агуркі, кабачкі.



# Перцы

Перцы любяць лёгкую, рыхлую, багатую на арганічныя рэчывы глебу. Яны патрабавальныя да цяпла, святла і вільгаці. Пры недахваце святла расліны выцягваюцца, кветкі і завязь ападаюць. На градах перцы можна вырошчваць пасля капусты, морквы, буракоў, бабовых (акрамя фасолі) і гарбузовых культур. Нельга садзіць перцы каля агуркоў і змешваць на адной градцы салодкія і вострыя сарты.

**У гэтым сезоне ААТ «МінскСортНасенАгародніна» прапануе вам наступныя сарты перцаў:**

| Сорт | Тэрмін выспявання | Вышыня расліны, см | Плод: форма | Плод: маса, г | Плод: колер плода | Плод: таўшчыня сценак, мм |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Перац салодкі (у 1 граме — 150—200 зярнят) | | | | | | |
| «Алеся» | сярэдняранні | 50—60 | конусападобная | 80—100 | чырвоны | 5—6 |
| «Богатырь» | сярэдняспелы | 60 | усечана-конусападобная | 140—160 | чырвоны | 5—6 |
| «Виктория» | сярэдняранні | 50 | конусападобная | 100—120 | цёмна-чырвоны | 5—6 |
| «Винни-Пух» | ранні | 30 | конусападобная | 50—70 | цёмна-чырвоны | 5—6 |
| «Гурман» | ранні | 60—70 | кубападобная | 120—130 | ярка-аранжавы | 5—7 |
| «Заря» | сярэдняспелы | 50—60 | конусападобны | 90—110 | чырвоны | 5—6 |
| «Калифорнийское чудо» | сярэдняспелы | 60—70 | кубападобная | 110—130 | цёмна-чырвоны | 5—6 |
| «Колобок» | ранні | 35—45 | акруглая | 90—100 | цёмна-чырвоны | 7—9 |
| «Кубик красный» | сярэдняспелы | 60—70 | кубападобная | 120—140 | цёмна-чырвоны | 6—7 |
| «Лумина» | сярэдняранні | 45—50 | конусападобная | 100—120 | чырвоны | 5—6 |
| «Ночка F1» | сярэдняпозні | 50—60 | кубападобная | 100—120 | цёмна-чырвоны | 5—7 |
| «Ожаровский» | сярэдняспелы | да 100 | цыліндрычны | 100—120 | цёмна-чырвоны | 6—7 |
| «Парнас» | сярэдняспелы | да 60 | кубападобная | 130—160 | жоўта-аранжавы | 6—8 |
| «Подарок Молдовы» | сярэдняспелы | 40—50 | конусападобная | 100—120 | чырвоны | 5—6 |
| «Топбой» | сярэдняспелы | 50—60 | акруглая | 100—120 | залаціста-жоўты | 8—9 |
| «Топгёрл» | сярэдняранні | 50—60 | таматападобная | 80—100 | чырвоны | 7—8 |
| «Тройка» | сярэдняранні | 50—60 | конусападобная | 90—110 | чырвоны | 5—6 |
| Перац востры (у 1 граме — 170—220 зярнят) | | | | | | |
| «Каин» | сярэдняранні | 40—50 | падоўжаная конусападобная | 20—30 | цёмна-чырвоны | 1—2 |


## Набыць насенне ААТ «МінскСортНасенАгародніна» вы можаце па адрасах:

**аптовы продаж:**
223017 Мінскі р-н, пас. Гатава
тэл.: (017) 503-41-80, 503-41-56, 503-41-58;
факс: (017) 503-60-00
**дробнааптовы продаж:**
220014 г. Мінск, вул. Мініна, 21, корп. 1
тэл./факс: (017) 226-25-85, 226-38-79.

**Рознічны продаж** ажыццяўляецца праз фірменныя магазіны **«НАСЕННЕ» ААТ «МінскСортНасенАгародніна»** па адрасах:
**г. Мінск:** вул. Кісялёва, 36; Камароўскі рынак (на адкрытым рынку); вул. Я. Коласа, 48; вул. Барадзінская, 31; Чэрвеньскі рынак (павільён); прасп. Газеты «Праўда», 24а; вул. Мініна, 21, корп. 1; вул. Алтайская, 64, корп. 1; вул. Дуніна-Марцінкевіча, 10; вул. Станіслаўскага, 34; вул. Альшэўскага, 73; перасячэнне вул. Адзінцова—Якубоўскага;
**г. Барысаў,** прасп. Рэвалюцыі, 30;
**г. Маладзечна,** вул. Міру, 12;
**г. Жодзіна,** прасп. Сыракваша, 3.


# ПЯТНІЦА, 9 ЛЮТАГА

**6.00, 17.00 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».**
**6.45, 0.55** Дзень спорту.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 9.05** Прэс-агляд.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.30, 8.30** «Дзелавое жыццё».
**9.10, 20.00 Серыял «Прымадонна».**
**10.00** «Шпілька».
**10.35 Серыял «Каханне як каханне».**
**11.30** «Вылечваючы дзіцячыя сэрцы».
**12.10** «Сфера інтарэсаў».
**12.30 Меладрама «Мяшчэрскія».**
**14.05** «Нятленныя ноты». «Фрыдрых Гендэль».
**14.30** «Брытва Акама».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мультфільмы.
**15.50, 1.05 Серыял «Джыўс і Вустэр».**
**17.55** «Усе стыхіі».
**18.25** «У свеце матораў».
**19.35** «Зона Х. Вынікі тыдня».
**21.00** «Панарама».
**21.40 Драма «Алігарх».**



*Раман па-мастацку інтэрпрэтуе сюжэт, звязаны з кар'ерай Барыса Беразоўскага і яго паплечнікаў па ЛагаВАЗу.*

**0.00** «Культурныя людзі».

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 20.30, 23.30** Нашы навіны.
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 Серыял «Талісман».**
**9.55 Серыял «Сёстры па крыві».**
**10.50** «Бісквіт».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05 Серыял «Сабачая справа».**
**14.00** «Дэтэктывы».
**14.30** «Ералаш».
**14.45** Тэніс. Матч сусветнай групы Кубка Дэвіса 2007 года. 1/8 фіналу. Беларусь—Швецыя.
**20.00** Час.
**21.00, 23.45** Навіны спорту.
**21.05** «Розыгрыш».
**22.15** «Сярэбраны грамафон».
**23.50 Эндзі Лоу ў фільме «Дом лятаючых кінжалаў».**

**7.00** «Ранішняя падзарадка».
**8.00, 17.25 Серыял «Салодкі плод».**
**8.50, 15.50** Навіны культуры.
**9.00** «У гэты дзень».
**9.05 Серыял «Гарадскі раманс».**
**9.55, 21.30 Серыял «Двое з куфэрка».**
**10.50 Серыял «Залатая цешча».**
**11.10** «Ядзім дома».
**11.40** «Анекдот. LAD».
**12.05** Мультфільм.
**12.20 Серыял «Вялікія спакусніцы кіно». Франсуаза Арну.**
**12.45** «Спорт, спорт, спорт...».
**13.15** «Анекдот. LAD».
**13.30** «О каханне маё бясконцае...».
**14.20** «Ружа ў чыстым полі». Спектакль.
**16.00** Дак. фільм «Напалеон Орда».
**16.10** Мультсерыял «Атэль прывідаў».
**16.35 Серыял «Прыгоды Скіпі».**
**17.00** «Жансавет».
**18.30** Хакей. Кубак Палесся. Беларусь—Латвія. Прамая трансляцыя.
**20.50** «Калыханка».
**21.05** «Беларуская часінка».
**22.00** «Правы чалавека».
**22.15 Серыял «Двое з куфэрка».**
**23.10** Баскетбол. НБА. Агляд тыдня.
**23.40** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.
**0.45 Камедыя «Сакрэт Фараона».**

**ТВ РЕН**

**6.05, 17.20** «Міншчына».
**6.15, 7.40** «З чаго пачынаецца раніца».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**8.40** «Аўтапанарама».
**9.00 «Салдаты 7». Серыял.**
**10.00** «Сталкер».
**10.40** «Тэма дня».
**10.45** «Дарагая перадача».
**11.00** «Гадзіна суда: справы сямейныя».
**12.00** «Гадзіна суда».
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50, 18.25 «Пяць мінут да метро» Серыял.**
**14.50** «Геркулес». Мультсерыял.
**15.15** «Неверагодныя гісторыі».
**16.00** «Ёсць кантакт».
**16.50 «Трое зверху». Серыял.**
**17.30** «Званая вячэра 2».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, малыш».
**20.30 Камедыя «Джым з Пікадзілі».**



*Ён сустрэў дзяўчыну сваёй мары. Ёсць толькі адна загвэздка: яна будзе любай са сваім кавалерам, калі не даведаецца, як яго завуць на самай справе.*

**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.30 Трылер «Злавесная сіла».**
**0.45** «Па поўнай праграме».
**1.25 «4400». Серыял.**

**Мир**

**6.00** Зараджайся!
**7.30 Серыял «Ноеў каўчэг».**
**8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**8.45, 12.00, 22.30** Студыя 60—90.
**9.00** Даведнік.
**9.30** Ток-шоу «Спрэчная тэрыторыя».
**10.30** Дак. серыял «Будучыня».
**12.15, 22.45** «У старых рытмах».
**13.45** Урокі англійскай мовы.
**14.00** Дзіцячы сеанс «Экхарт».
**15.00** Дак. серыял «Сливки общества».
**16.00 Серыял «Чалавек мора».**
**17.00** Дак. серыял «Вясельныя вар'яцтвы».
**18.00** Акцэнты.
**18.15** Канцэрт. Вардан Маркас.
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Лепшае з «Джэнтльмен-шоу».
**21.00 Серыял «Бушыдо — шлях воіна».**
**22.00** Акцэнты+.

**Восьмой**

**7.00** «Сад і агарод-плюс».
**7.15, 9.55, 21.05, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.20 Маст. фільм «Новыя часіны».**
**8.55** «К-гульня».
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «Топ-8».
**9.50, 21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**10.00 Маст. фільм «Ва ўладзе страху».**
**12.00** «Тэлечат — «8 канал».
**16.30** Мультпарад.
**16.40** «К-відэа для дзяцей».
**17.00 Маст. фільм «Капітанская дачка».**
**18.40** «Дзіно».
**19.00** Гісторыя ў асобах.
**19.40** «Сад і агарод».
**19.45 Серыял «Прыгоды сакрэтнага агента».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10** «Каралі муай тай».
**21.25** «Героі коміксаў на экране».

**РОССИЯ**

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**9.10** «Мой сярэбраны шар. Вера Марэцкая».
**10.00 Серыял «Тайны следства-3».**
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 14.20, 17.20, 19.45** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.50 Серыял «Ад'ютанты кахання».**
**13.45. 16.40, 18.40** Весткі. Дзяжурная часць.
**14.40** «Пакой смеху».
**15.30** Суд ідзе.
**17.40 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».**
**20.05** Добрай ночы, малышы!
**20.15** «Юрмала».
**22.05 Драма «Дастукацца да нябёсаў».**
**23.40 Дэтэктыў «Гонкі па вертыкалі».**

**НТВ Беларусь**

**8.00. 8.30, 9.00, 9.30, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10, 8.35, 9.10, 9.35** Сёння раніцай.
**10.25** «30-я глава».
**10.55** «Крымінальная Расія».
**11.20 Серыял «Фабрыка мараў».**
**12.10** «Дзве праўды».
**13.25 Серыял «Сталін. Live».**
**14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў 6».**
**15.05** «Авіятары».
**15.35** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**18.10** «Крымінальная Расія».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** «Следства вялі...».
**20.40 Драма «Банды Нью-Йорка».**
*Нью-Йорк, 1863 год. Існаванне нацыі знаходзіцца пад пагрозай Грамадзянскай вайны, на вуліцах зараджаецца небяспечны, злачынны свет.*
**23.25 Камедыя «Love-сервіс».**

**ТВ ЦЕНТР**

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 20.15 «Расплата за грахі». Серыял.**
**8.25 Маст. фільм «Балада аб доблесным рыцары Айвенга».**
**10.15** «Рэпарцёр».
**10.30, 13.30, 16.30, 23.25** Пятроўка, 38.
**10.45, 13.45, 16.45, 19.45** Падзеі.
**11.00** «Паляўнічыя за галовамі».
**11.35, 2.10 «Адна справа на дваіх». Серыял.**
**12.50** Дзелавая Масква.
**14.00** Небяспечная зона.
**14.30 «Зачараваны ўчастак». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**17.15** «Формула ўдачы».
**17.45 «Страсці па-італьянску-2». Серыял.**
**18.50** Ключавы момант.
**21.10** Момант ісціны.
**22.00** «Народ хоча ведаць».
**22.55** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.40 «Тэльма і Луіза».**



*Бойфрэнд афіцыянткі Луізы — музыкант, часта забываецца пра сваю каханку. Муж Тэльмы мяркуе, што ўдзел жонкі — кухня. Такое жыццё не задавальняе жанчын, і яны ўцякаюць з абрыдлага гарадка.*

**3.20 «Кардзье — вартавыя парадку». Серыял.**
**4.50** «Адважны Робін Гуд». Мультфільм.

**EUROSPORT**

**9.30** Парусны спорт.
**9.45, 23.30** Чэмпіянат свету. «Ралі Швецыі».
**10.15** Санны спорт. Кубак свету ў Аўстрыі.
**10.45, 15.45** Футбол. Еўра-2008.
**11.45, 14.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Італіі.
**12.45, 16.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Швецыі.
**18.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі.
**20.00** Лёгкая атлетыка.
**22.00** Цімберспортс. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі.
**22.30** Покер. Еўратур.
**0.00** Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
**0.30, 2.15** Навіны Еўраспорту.
**0.45** Экстрэмальны спорт.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «РАСІЯ» 22.05 «ДАСТУКАЦЦА ДА НЯБЁСАЎ» (ГЕРМАНІЯ—НІДЭРЛАНДЫ, 1997 Г.)

*Узнагароды: прыз за галоўную мужчынскую ролю на Маскоўскім КФ (1997 г.).*

Марцін і Рудзі даведваюцца, што абодва смяротна хворыя і жыць ім засталося некалькі дзён. Высветліўшы, што Рудзі ніколі не бачыў мора, Марцін хоча, чаго б гэта ні каштавала, ажыццявіць мару свайго новага сябра.

**Рэжысёр** — Томас Ян. **У ролях:** Ціль Швайгер, Ян Йозеф Ліферс, Т'еры ван Вэрвеке, Морыц Бляйбтроб, Хууб Штапель.




# Доктор Алексей Алексеевич ХАДОРКИН:

*при алкогольной, никотиновой, пищевой зависимости люди пытаются бороться со стрессом, употребляя спиртные напитки, сладкое, пищу, включающую жиры и муку, никотин. Это неправильно! Если вы сами не можете отказаться от этих привычек, мы окажем психологическую помощь. Так же успешно лечатся псориаз и энурез у детей.*

**Запись на прием по телефонам:**

Минск 292-72-73
Брест 25-14-67
Барановичи 42-06-95
Борисов 73-37-77
Бобруйск 46-22-01
Витебск 36-40-30
Молодечно 7-01-88
Орша 21-40-40
Полоцк 43-58-61
Солигорск 7-32-39
Слуцк 2-99-19
Жлобин 5-11-42
Могилев 27-26-48
Пинск 37-32-42
Светлогорск 2-72-71; 2-16-55
Речица 3-52-77
Мозырь 2-94-74; 40-60-85;
Гродно 74-04-24; 41-42-39;
Волковыск 2-11-85;
Лида 4-59-20.

Лицензия МЗ РБ № 02040/0311208 от 27.10.2006 г. до 27.09.2011 г.


# СУБОТА, 10 ЛЮТАГА

**6.35** «Дзень спорту».
**6.45** Мультфільм.
**7.05 Серыял «Адзін год на вінаградніках».**
**7.30** «Існасць».
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Ранішняя хваля».
**9.40** «Кухня гумару».
**10.15** «Альманах падарожжаў».
**10.45** «Вось такія пірагі».
**11.25** «У свеце матораў».
**12.15 Камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя».**
**14.00** «Алімпійская віза. На шляху да Пекіна-2008».
**14.30** «Парламент у асобах».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х. Вынікі тыдня».
**15.55** «Зямельнае пытанне».
**16.15** «Спяваю і слухаю..». Канцэрт, прысвечаны памяці народнага артыста Беларусі і СССР Ул. Мулявіна.
**17.25** «Вакол планеты».
**17.55** «Ваша лата».
**19.10 Меладрама «Зімовая спёка».**
**21.00** «Панарама».
**21.45** «ЕўраФэст. Дзень за днём».
**21.55 Драма «Жыццё Дэвіда Гейла».**
**0.15** «Галерэя вобразаў».

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** Спецрасследаванне. «Мурат Насыраў. Дзве версіі драмы».
**12.05** Дак. серыял «Сакрэты фільмаў аб дзікай прыродзе».
**12.35** «Тэлечасопіс «Саюз».
**13.20** «Звярынец».
**13.50** «Кантрольная закупка».
**14.20** «Геніі і злыдзеі». Жуль Верн.
**15.00** Тэніс. Матч сусветнай групы Кубка Дэвіса 2007 года. 1/8 фіналу. Беларусь—Швецыя.
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05 Маст. фільм «Ненармальная».**
**22.55 Баявік «Пасажыр 57».**

**8.00** «Благавест».
**8.30** «Дзіцячая гадзіна».
**9.35** Мультфільм.
**9.40 Серыял «Дынатопія».**
**10.20** «Добрыя навіны».
**10.50** «Школа рамонту».
**11.40** Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстафета 4 x 7,5 км. Мужчыны.
**13.15** «Па старонках «Залатога шлягера-2005».
**13.35** «Сезон у дачы».
**14.00** «Тэатр. Выбранае».
**14.40** «Плошча мастацтваў».
**15.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка з масавым стартам 12,5 км. Жанчыны.
**16.10** «Святло далёкай зоркі. Ніна Ватацы».
**16.35** «Лёс чалавека». Сям'я Куцко.
**17.00 Камедыя «Кадрыль».**
**18.30** Хакей. Кубак Палесся. Беларусь—«Салават Юлаеў» (Расія). Прамая трансляцыя.
**20.50** «Анекдот. LAD».
**21.10 Камедыя «Хатабыч».**
**22.50** Баскетбол. НБА. Маямі Хіт — Кліўленд Кавальерз.

**ТВ РЕН**

**6.10** «Дзікая планета»: «Манах, прынцэса і лес». Дак. фільм.
**7.00** «Ваенная тайна».
**7.45** «Анфас».
**8.00** «Раз — гарох, два — гарох...». Мультфільм.
**8.05 Фільм-казка «Блукаючыя агеньчыкі».**
**9.10** «Голы кухар».
**9.45** «Наш дом».
**10.10** «Мінск і мінчане».
**10.40** «Крымінальнае чытво».
**11.30** «Лёсу свайго гаспадыня».
**12.00 «Татачкаў сынок». Серыял.**
**13.00** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.45 Маст. фільм «Візіт да Мінатаўра».**
**15.15** «Народжаны ў СССР».
**16.00** «Надзвычайныя гісторыі»: «Падводныя піраты, або Чорная метка рэкеру».
**16.55** «Відзьма-нявідзьма».
**17.30** «Гучная справа»: «Смерць пасля навальніцы». Дак. фільм.
**18.30** «Прыватныя гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Баявік «Хронікі Рыдзіка».**
**22.30** «Схема смеху».
**23.20 «Мяне завуць Эрл». Серыял.**
**23.45 Драма «Простая гісторыя».**
**1.40** «In reality».
**2.05 Камедыя «Джым з Пікадзіллі».**

**Мир**

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Закон джунгляў».**
**9.00** Мар, дзейнічай, будзь!
**9.30** «Хіт-экспрэс».
**10.30** «Пісьмы любімаму гораду».
**11.00** Даведнік.
**11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** «Казка, расказаная ўначы».
**14.00** Студыя 60—90.
**14.15** Казахстан: старонкі гісторыі.
**16.00** Аднакашнікі.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Краіна мая.
**18.45** Дак. серыял «Чароўная планета».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Спецыяльны рэпартаж.
**21.00 Маст. фільм «Ульцімо-2».**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

**Восьмой**

**9.00** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00, 23.30** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Каралі муай тай».
**10.15 Маст. фільм «Палюбоўнік».**
**12.15 Серыял «Двайны агент».**
**13.45 Маст. фільм «Залаты муж».**
**15.15** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Міс Марпл вядзе расследаванне».**
**18.45** «Сад і агарод-плюс».
**19.00 Меладрама «Успаміны».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Джэймс Бонд—агент 007».**
**23.25** «Навіны кіно».

**РОССИЯ**

**7.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**7.10** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Ваенная праграма».
**9.30** «Ранішняя пошта».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.15** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.25** Аншлаг і кампанія.
**12.20** Суботнік.
**13.00** Вакол свету.
**14.20 Маст. фільм «У страляючай глушы».**
**15.50** Ток-шоу «Нацыянальны інтарэс».
**16.40** «Формула ўлады».
**17.10** У гарадку.
**17.20** Мясцовы час. Тыдзень у горадзе.
**18.00** «Сакрэт поспеху».
**19.00** Весткі. Дзяжурная часць.
**19.30** «Прыватны дэтэктыў».
**20.20** «Суботні вечар».
**22.10 Камедыя «Памылкова абвінавачаны Леслі Нільсен».**
**23.45** «Ты і я». Канцэрт Леаніда Агуціна і Анжэлікі Варум.
**1.20 Баявік «Цягнік смерці».**

**НТВ Беларусь**

**9.00** «Без рэцэпта».
**9.30** «Агляд».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**14.00 Камедыя «Дзелавыя людзі».**
**15.40** Асарці.
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.05 Драма «Незабудкі».**
**19.45** «Прафесія — рэпарцёр».
**20.15** «Праграма максімум».
**21.15** «Рускія сенсацыі».
**22.00** «Рэальная палітыка».
**22.40 Меладрама «Сакратарка».**
**0.30** «Мікс-файт М-1. Баі без правілаў».

**ТВ ЦЕНТР**

**5.10 «Следапыт».**
**7.00** Марш-кідок.
**7.30** Праваслаўная энцыклапедыя.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45** «Казка пра папа і работніка яго Балду». Мультфільм.
**9.05** АБВГДэйка.
**9.35 Фільм-казка «Пунсовая кветачка».**
**10.45. 13.45, 16.45, 23.10** Падзеі.
**11.05** Сонечны круг.
**11.55** «Сто пытанняў да дарослага».
**12.50** Гарадскі сход.
**14.00** «Цуд-зброя і містыка ў Трэцім рэйху».
**14.50 Дэтэктыў «Груз без маркіроўкі».**
**17.00** «Музыка пад купалам цырка».
**18.00 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці».**
**20.00** «Пастскрыптум».
**21.00 Дэтэктыў «Па-за часам».**
**23.25 Баявік «Крымінальны раман».**
**2.15 «Адна справа на дваіх».**
**3.25 Дэтэктыў «Забойства ў Саншайн-Менор».**

**EUROSPORT**

**9.30** Футбол.
**10.00, 20.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі.
**11.00** Санны спорт.
**11.30, 15.00, 18.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Італіі.
**13.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Швецыі.
**16.00** Тэніс. Турнір WTA ў Францыі.
**21.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Польшчы.
**23.00** Сума.
**0.00, 2.30** Чэмпіянат свету. «Ралі Швецыі».
**0.30** Навіны Еўраспорту.
**0.45** Байцоўскі клуб.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «СТБ» 23.45 «ПРОСТАЯ ГІСТОРЫЯ» (ЗША—ФРАНЦЫЯ, 1999 Г.)

Алвін Стрэйт даведваецца аб тым, што яго старэйшы брат, з якім ён не размаўляў больш за 10 гадоў, цяжка захварэў. Кінуўшы ўсё, сямідзесяцітрохгадовы фермер, нягледзячы на кпіны і апасенні навакольных, садзіцца на газонакасілку, каб пераадолець 350 кіламетраў, якія аддзяляюць яго ад брата.

**Рэжысёр** — Дэвід Лінч. **У ролях:** Рычард Фарнсворт, Сісі Спэйсек, Гары Дзін Стэнтан.



# НЯДЗЕЛЯ, 11 ЛЮТАГА

**6.35** Мультфільмы.
**7.05 Серыял «Адзін год на вінаградніках».**
**7.30** «Брытва Акама».
**8.00** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00. 15.00** Навіны.
**9.05** «Арсенал».
**9.35** «Усе стыхіі».
**10.10** «Тайны смак».
**10.45** «Шпілька».
**11.25** «КомпаС».
**12.10 Камедыя «Адзінокім прадастаўляецца інтэрнат».**
**13.45** «Здароўе».
**14.20** «Сузор'е надзей».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** КВЗ.
**17.15** «Час кіно».
**17.55** «Суперлато».
**18.50 Трагікамедыя «Акно ў Парыж».**



*Добра выпіўшы, жыхары пецярбургскай камуналкі адкрываюць акно ...у Парыж. З гэтага часу пачынаюцца прыгоды французскіх «гасцей» на берагах Нявы.*

**21.00** «Панарама тыдня».
**22.30 Меладрама «Дзеці веку».**
**0.55** «ЕўраФэст. Дзень за днём».

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная прапаведзь.
**9.15 Серыял «Сябры».**
**9.50** «Бесталковыя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** «Ранішняя пошта».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.40** Ералаш.
**13.00** Тэніс. Матч сусветнай групы Кубка Дэвіса 2007 года. 1/8 фіналу. Беларусь—Швецыя.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.35 Жан Рэно ў фільме «Васабі».**
**23.25** «Камедзі Клаб».

**7.50** «Мір вашаму дому».
**8.00** «Дзіцячая гадзіна».
**9.05** Мультфільм.
**9.35 Серыял «Дынатопія».**
**10.15** «Як гэта робіцца».
**10.40** «ПРАсоўванне+».
**10.55** «Смачная раніца».
**11.25** «Сама сабе гаспадыня».
**11.55, 15.10** Біятлон. Чэмпіянат свету.
**13.30** «Па старонках «Залатога шлягера-97».
**13.45** «Спявай, душа!».
**14.10** «Гаспадар».
**14.40** «Слова пісьменніка».
**16.05** «ПРАсоўванне+».
**16.20** «Вас выклікае Спартландыя».
**17.00 Камедыя «Белыя росы».**
**18.30** Хакей. Кубак Палесся. Беларусь—Канада. Прамая трансляцыя.
**20.50** «Анекдот. LAD».
**21.10** «Тэлебарометр».
**21.25** «Жаночая ліга».
**21.50** «Наша Russia». Гумарыстычная праграма.
**21.15 Трылер «Вірус-уцякач».**
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Арсенал—Уіган.

**ТВ РЕН**

**6.10** «Дзікая планета»: «Дрэва, якое спявае». Дак. фільм.
**7.00** «Суперняня».
**7.45** «Містэр Пронька». Мультфільм.
**8.10 Фільм-казка «Блукаючыя агеньчыкі».**
**9.15** «Аўтапанарама».
**9.40** «Відавочца».
**10.30** «Вялікае снеданне».
**11.05** «Культурнае жыццё».
**11.35** «Добры дзень, доктар!».
**12.05 «Татачкаў сынок». Серыял.**
**13.05** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.50 Маст. фільм «Візіт да Мінатаўра».**
**15.15** «И вам при встрече я скажу...». Уладзімір Ушакоў.
**16.00** «Новыя падарожжы дылетанта».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Неверагодныя гісторыі».
**17.40** «Нацыянальны здабытак». Навука.
**18.10** «Вялікія мазгаломы».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.45 Меладрама «Маё жыццё без мяне».**
**22.45** «Спартыўны тыдзень».
**23.15** Чэмпіянат свету па ралі-2007. Швецыя.
**0.15** «Па поўнай праграме».
**0.55 «4400». Серыял.**
**1.40 Баявік «Хронікі Рыдзіка».**

**Мир**

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Згубленыя светы».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Закон джунгляў».**
**9.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**9.15** Дзеці сонца.
**9.30** «Парад парадаў».
**10.30** «Хвост каметы».
**11.30, 14.30, 17.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры: Людміла Шагалава.
**12.15 Камедыя «... А вы кахалі калі-небудзь?»**
**14.00** Студыя 60—90.
**14.15** Сямейны альбом.
**16.00** Паэзія Арменіі.
**16.15** Любоўныя гісторыі.
**16.45** Арт-рэвалюцыя.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Каму на Русі жыць добра.
**18.45** У нашу гавань заходзілі караблі.
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Ульцімо-2».**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

**Восьмой**

**9.00, 18.55** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00 Маст. фільм «Джэймс Бонд — агент 007».**
**12.00 «Двайны агент».**
**13.45 Маст. фільм «Старыя разбойнікі».**
**15.20** «К-відэа для дзяцей».
**15.40 Фільм для дзяцей.**
**16.45 Маст. фільм «Якой не даравалі».**
**18.45** «К-відэа Топ-8».
**19.00 Камедыя «Хітры ліс».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Пароль».**
**23.30** «Навіны кіно».

**РОССИЯ**

**7.00, 11.00, 14.00** Весткі.
**7.15 Маст. фільм «Позняя сустрэча».**
**8.35** Мультфільмы.
**9.00** «Дыялогі пра жывёл».
**9.30** «Здароўе».
**10.00** «Сам сабе рэжысёр».
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Гарадок. Дайджэст».
**11.50** «Смехапанарама».
**12.20** «Чаканне імператрыцы».
**14.20** Фитиль.
**15.05 Маст. фільм «След у акіяне».**
**16.35** Мультфільмы.
**17.10** «Смяяцца дазваляецца».
**19.00** «Весткі тыдня».
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30 Камедыя «Вам букет».**
**22.20 Камедыя «Цяпер або ніколі».**
**23.55 Баявік «Спецыяліст».**

**НТВ Беларусь**

**9.30** «Дзікі свет».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Усё адразу!».
**10.55** «Шчаслівы рэйс».
**11.45** «Іх норавы».
**12.25** «Авіятары».
**13.25** «30-я глава».
**13.50 Камедыя «Асенні марафон».**
**15.35** Асарці.
**16.30** «Адзін дзень. Новая версія».
**17.05 Серыял «Адвакат».**
**19.00** Сёння. Вынікова праграма.
**19.45** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.00** «Галоўны герой».
**22.05** «Нядзельны вечар».
**23.10 Драма «Пра вырадкаў і людзей».**

**ТВ ЦЕНТР**

**7.00** Дзённік падарожніка.
**7.25** Сялянская застава.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45** «Рэпарцёр».
**9.00** На дачы.
**9.35** Нашы любімыя жывёлы.
**10.10** «Музычная гісторыя». Валерый Сюткін.
**10.45** Падзеі.
**10.55 Маст. фільм «Добрай раніцы».**
**12.40** «Запрашае Барыс Ноткін».
**13.10** «21 кабінет».
**13.45** Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
**14.25** «Тут жывуць драконы».
**15.15 Камедыя «Гуляй, як Бэкхэм».**
**17.15** «Сапраўднае жыццё Васіля Чапаева».
**17.55 «Спадчынніцы». Маст. фільм.**
**20.00** «У цэнтры падзей».
**21.05 Дэтэктыў «Шатун».**
**23.15** Падзеі.
**23.30 Трылер «24 гадзіны».**
**1.30** Мотадром.
**2.00 «Адна справа на дваіх».**
**3.10 Маст. фільм «Удава з вострава Сен-П'ер».**

**EUROSPORT**

**9.30** Санны спорт.
**10.00, 15.00, 0.30** Біятлон.
**13.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Швецыі.
**16.45** Тэніс. Турнір WTA ў Францыі. Фінал.
**18.00** Лёгкая атлетыка.
**20.00** Скачкі на лыжах з трампліна.
**21.00, 1.30** Агляд снежнага уік-энда.
**21.30** Бокс.
**23.00** Сума.
**0.00, 2.00** Чэмпіянат свету. «Ралі Швецыі».
**1.15** Навіны Еўраспорту.

***У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!***

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «ТБЦ» 15.15 «ГУЛЯЙ, ЯК БЭКХЭМ» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ГЕРМАНІЯ, 2002 Г.)

Гульня ў жаночай футбольнай камандзе, сімпатычны трэнер, першыя перамогі кружаць галаву Джэсі. Але, здаецца, у мітусні напярэдадні вяселля сястры яе тайна будзе раскрыта.

**Рэжысёр** — Гурындэр Чадха. **У ролях:** Пармін-дэр К. Награ, Кіра Найтлі, Джонатан Рыз-Мейерс, Анупам Кхер, Фрэнк Харпер, Шахін Хан.




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 635. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12